Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 САКАВІКА 2014 г. АЎТОРАК № 40 (27650) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## НА ВАРЦЕ ПРАВАПАРАДКУ І СТАБІЛЬНАСЦІ

Таварышы афіцэры і генералы, паважаныя супрацоўнікі органаў унутраных спраў, дарагія ветэраны!

Ад усёй душы віншую вас з прафесійным святам — Днём міліцыі.

Абараняючы гарантаваныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь правы, свабоды і жыццё грамадзян, вы ўносіце важкі ўклад у забеспячэнне правапарадку і сацыяльна-палітычнай стабільнасці грамадства.

Вы ўвасабляеце лепшыя чалавечыя якасці: адказнасць, мужнасць, гатоўнасць прыйсці на дапамогу і ўменне дзейнічаць у экстрэмальных умовах. Вашымі штодзённымі намаганнямі забяспечваецца высокі ўзровень бяспекі грамадзян, які па праве з'яўляецца візітнай карткай Беларусі. Але галоўным паказчыкам поспеху ў рабоце супрацоўнікаў міліцыі з'яўляюцца павага і давер да вас простых людзей.

Дзякуй за службу Радзіме. Моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту вам і вашым блізкім.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## НЕ ЗНІЖАЮЧЫ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ

**Прадпрыемствы «Белнафтахіма» з 2011 года ў тры разы павялічылі дадатнае сальда знешняга гандлю да $5,6 млрд.**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 3 сакавіка прыняў з дакладам старшыню канцэрна «Белнафтахім» Ігара Жыліна. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У цэнтры ўвагі на сустрэчы была работа прадпрыемстваў галіны, асноўныя фінансава-эканамічныя паказчыкі іх дзейнасці. Так, за перыяд з 2011 года дадатнае сальда знешняга гандлю ў цэлым па галіне павялічылася ў 3 разы з $1,9 млрд да $5,6 млрд. «Нават у цяжкі час мы не зніжаем эфектыўнасці. Рэнтабельнасць продажаў нашых арганізацый не зніжаецца ніжэй за 10 працэнтаў», — сказаў старшыня канцэрна.

Ігар Жылін таксама далажыў аб рэалізацыі праграмы мадэрнізацыі. «Мы ўвялі тысячу новых аб'ектаў, выконваем праграму мадэрнізацыі, у тым ліку эканамічнай. Мы ўжо вывелі на аўтсорсінг шэраг структур нашых прадпрыемстваў, якія ажыццяўляюць на прадпрыемствах дапаможныя функцыі», — расказаў ён.

Акрамя таго, прадпрыемствы канцэрна значна пашырылі наменклатуру выпускаемых імпартазамяшчальных тавараў.

На сустрэчы таксама абмяркоўваўся шэраг кадравых пытанняў.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ СІ ЦЗІНЬПІНУ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні старшыні КНР Сі Цзіньпіну ў сувязі з тэрарыстычным актам у горадзе Куньмін. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Як паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы, вечарам 1 сакавіка больш як 10 узброеных злачынцаў атакавалі пасажыраў на плошчы і ў зале перад білетнымі касамі на чыгуначным вакзале Куньміна, у выніку чаго, паводле даных, загінулі 29 чалавек і больш як 130 атрымалі раненні.

## ПАТРЭБНА ПРАЗРЫСТАЯ НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВАЯ БАЗА Ў ГАЛІНЕ АТЭСТАЦЫІ Ў БУДАЎНІЦТВЕ

**Такое меркаванне выказаў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на нарадзе ў Мінбудархітэктуры па рэалізацыі Указа № 26 «Аб удасканаленні дзейнасці ў будаўнічай галіне», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва.**

«Нам патрэбна празрыстая і зразумелая нарматыўна-прававая база ў галіне атэстацыі ў будаўніцтве. Умовы павінны быць аднолькавыя для ўсіх. І калі ты прадстаўляеш дзяржаўнае прадпрыемства, гэта не значыць, што ты раднейшы і твае інтарэсы нам бліжэйшыя. Галоўнае, каб усе новыя нарматыўныя прававыя акты садзейнічалі павышэнню эфектыўнасці работы будаўнічага комплексу», — цытуе словы прэм'ер-міністра прэс-служба Мінбудархітэктуры.

«Мы максімальна ўлічым усе пажаданні, але, напэўна, усім дагадзіць немагчыма, — сказаў міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Анатоль Чорны. — Аднак мы зробім усё для таго, каб усе працэдуры былі празрыстыя і даступныя для нашых партнёраў-заяўнікаў з іншых краін. У прыватнасці, з расіянамі мы гэтыя пытанні ўжо актыўна абмяркоўвалі».

■ Фінансы

## ПАДЗЕННЕ РАСІЙСКАГА РУБЛЯ НА НАС НЕ ПАЎПЛЫВАЕ

**Таму што палітыка Нацыянальнага банка Беларусі накіравана на плаўную дэвальвацыю. Арыенцірам пры гэтым з'яўляецца курс долара ЗША.**

«Зыходзячы з дынамікі курса беларускага рубля, які апошнім часам толькі ўмацоўваўся адносна расійскай валюты, нягледзячы на аслабленне апошняй, можна меркаваць, што наўрад ці беларускі рубель будзе зніжацца тымі ж тэмпамі, якімі падае расійскі», — паведаміў карэспандэнту «Звязды» фінансавы аналітык афіцыйнага партнёра «Альпары» ў Мінску Вадзім Іосуб. Эксперт сцвярджае, што цяперашняя палітыка Нацбанка, хутчэй за ўсё, захаваецца, а значыць, курс айчыннай валюты будзе, як і раней, плаўна зніжацца адносна замежных валют. Аднак Расія — асноўны гандлёвы партнёр Беларусі, і курс «расіяніна» ўплывае на наш экспарт. «Патрэбна максімальна актыўна шукаць новыя рынкі для беларускай прадукцыі», — пракаментаваў сітуацыю эксперт.

Нагадаем, што ўчора курсы долара і еўра «ўзляцелі» на Маскоўскай біржы, абнавіўшы гістарычныя максімумы. Расійскі рубель рэкордна ўпаў на фоне інфармацыі пра магчымы ўвод расійскіх войскаў ва Украіну. У выніку долар ЗША стаў каштаваць 36,3784 рубля, а еўра — 50,1513 рубля.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## ВЯСНУ КІРМАШОМ ВІТАЮЦЬ

**Жыхары сталічнага Партызанскага раёна сустракалі сакавік сапраўдным кірмашом, які адбыўся на бульвары Трактарабудаўнікоў.**

На латках — прысмакі, каўбасы, кумпячкі, скрынкі, набітыя агароднінай, а перад імі — чэргі патэнцыйных пакупнікоў. Прадаўцы, якія прыехалі на кірмаш з розных куткоў Беларусі, не паспяваюць адысці ад прылаўка, каб абнавіць торбы, як чуюць адразу наўздагон чарговае пытанне ад мінакоў.

— Гандаль ідзе сапраўды добра! — трымаючы ў руках ланцужок каўбасак, кажа Валянціна Архіпава, прадавец Пастаўскага раённага спажывецкага таварыства, якая ўжо не першы раз прыязджае працаваць на кірмаш у сталіцу. — Прадаём і мяса, і сыры, і малочныя вырабы. Людзі забіраюць з прылаўкаў літаральна ўсё.

Не праціснуцца было і да палаткі кандытарскай фабрыкі «Чырвоны харчавік». Мінчукі не проста параўноўвалі кошты розных відаў вядомага ўсім беларусам бабруйскага зефіру, але і з веданнем справы абмяркоўвалі смак разнастайных гатункаў.

Хапала людзей і каля імправізаванай пляцоўкі, дзе не толькі нагадвалі пра будучыя выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, але і адбыўся невялічкі канцэрт.

— Кожны год у Мінску адбываецца шмат кірмашоў. Цэнтральная пляцоўка для нашага раёна вось тут — на бульвары Трактарабудаўнікоў, — кажа Уладзімір Зубрык, намеснік кіраўніка адміністрацыі Партызанскага раёна. — Гэта вельмі зручнае месца, і дзякуючы метро на наш кірмаш могуць прыехаць жыхары з розных куткоў сталіцы. Прадукцыя ёсць ва ўсіх прадпрыемстваў і яе, безумоўна, трэба рэалізоўваць. Мы даём ім такую магчымасць. Усім вядома, што на кірмашы могуць і кошты мяняцца, можна і таргавацца. У краме, вядома, так не зробіш, аднак тут гэта цалкам верагодна. Сёлета гэта першы наш кірмаш. Але мы плануем праводзіць падобныя мерапрыемствы ў раёне і надалей.

**Тарас ШЧЫРЫ.**







Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Спецыяльны рэпартаж

## У ЛЕВАЙ КІШЭНІ — СПАЙС, У ПРАВАЙ — ГРОШЫ

### Карэспандэнты «Звязды» назіралі затрыманне няпоўнагадовых наркагандляроў



Фота Надзеі БУЖАН.

**Амаль штодня Міністэрства ўнутраных спраў паведамляе аб выпадках затрымання маладых людзей, якія гандлююць наркотыкамі. Не паспяваюць затрымліваць і судзіць адных, як з'яўляюцца іншыя. На месцы «адсечанай» галавы адразу вырастаюць дзве новыя.**

**Аматары наркатычных рэчываў сцвярджаюць, што набыць апошнія ў Мінску можна без праблем. Галоўным памочнікам у гэтай справе з'яўляецца інтэрнэт. Тыповая сітуацыя — калі той, хто прадае, сам і ўжывае. Гэта зручна: заўсёды ёсць грошы на набыццё дурману. Узяць такіх вось «спажыўцоў-гандляроў» на месцы злачынства, з наркотыкамі і грашамі — палова справы. Важна высветліць, адкуль гэты «спажывец-гандляр» узяў злачынную атруту. Хто той чалавек, для якога наркотыкі — спосаб няблага жыць? Накідваючы невад на дробную рыбу, праваахоўнікі насамрэч палююць на буйную. Гэтыя амаль бясконцыя і заблытаныя ланцугі — асобная тэма. А зараз хацелася пабачыць якраз адлоўліванне «драбязы», азнаёміцца з руціннай аператыўнай працай, якая на ўзроўні раённых аддзелаў унутраных спраў вядзецца амаль кругласутачна.**

Варта заўважыць, што ў наркабарацьбе няма дзялення па тэрытарыяльным прынцыпе. У які РАУС паступіла аператыўная інфармацыя, той яе і распрацоўвае. Так што аператыўнікі з Першамайскага РАУС могуць працаваць на тэрыторыі Фрунзенскага…

Не сакрэт, што людзей, якія даюць інфармацыю, называюць «інфарматарамі». Такіх важных, каштоўных, а таму засакрэчаных асоб журналістам могуць паказаць хіба са спіны. Паводле атрыманых звестак нараджаецца план правядзення аперацыі, якая прадугледжвае спачатку выхад на падазроную асобу, а пасля — яе затрыманне на месцы злачынства.

Мы з фотакарам далучаемся у той момант, калі апранутыя ў цывільнае людзі размяшчаюцца па машынах, каб выехаць на «кропку». У аперацыі ўдзельнічае некалькі аўтамабіляў — не пазначаных, вядома, словам «міліцыя» і сіняй мігалкай. Візуальна злачынца ніколі не вылічыць гэтыя аўто.

Злачынцы выдатна ўсведамляюць, што захоўваюць і прадаюць не папкорн, а забароненыя законам рэчывы, а таму і хаваюцца, і перастрахоўваюцца. Бываюць аперацыі, калі аператыўнікі ганяюцца за злачынцамі шмат гадзін — назіраюць, як той, каго яны «вядуць», блытае сляды і перасоўваецца з месца на месца, часам нават з аднаго канца горада ў другі.

СТАР. 4

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ЛАЗАВІК, сакратар ЦВК:**

***«Перадвыбарная агітацыя ў краіне праходзіць без канфліктаў паміж кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў і СМІ. Пры Цэнтрвыбаркаме створаны Савет па разглядзе спрэчак, звязаных з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі пры правядзенні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. Пакуль Савет застаецца без работы. Яго ўмяшанне спатрэбіцца, калі ў ЦВК будзе інфармацыя пра канфлікты паміж кандыдатамі ў дэпутаты і СМІ, але такіх звестак за бягучую выбарчую кампанію яшчэ не паступала. Гэта радуе. Значыць, кандыдаты ў дэпутаты без праблем даносяць да выбаршчыкаў свае перадвыбарчыя ідэі з дапамогай радыёвыступленняў і публікацыі матэрыялаў у друкаваных СМІ».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.03.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9770,00 | ■ |
| Еўра | 13470,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 268,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 981,91 | ▼ |

■ Надвор'е

## БУДЗЕ БОЛЬШ СОНЦА

**На гэтым тыдні тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў вільготных паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку Украіны, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Максімальная тэмпература паветра ўдзень у аўторак чакаецца 1–7 цяпла. На працягу дня магчымыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Кароткачасовыя дажджы, пераважна па паўднёва-заходняй палове краіны, чакаюцца ў нас і 5–6 сакавіка. У гэтыя дні ў асобных раёнах магчымы туман, уначы і раніцай — галалёдзіца. Уначы ў сераду і чацвер тэмпературны фон будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, удзень — 2–8 цяпла.

А вось у пятніцу атмасферны ціск пачне істотна павялічвацца, таму істотных ападкаў ужо не будзе. Месцамі прагназуецца туман, уначы і раніцай — галалёдныя з'явы. Надвор'е стане больш сонечным. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 2–7 цяпла. Такі тэмпературны фон прыкладна на 2–4 градусы вышэй за кліматычную норму першай дэкады сакавіка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КРЫМ ЗАЯВІЎ АБ ПЕРАХОДЗЕ НА ЯГО БОК АВІЯБРЫГАДЫ

Ва ўрадзе Крыма заявілі аб пераходзе на бок рэгіянальных улад 204-й знішчальнай авіябрыгады ВПС Украіны, на ўзбраенні якой знаходзяцца знішчальнікі МіГ-29 і вучэбныя Л-39. Пра гэта са спасылкай на неназванага прадстаўніка кабінета міністраў аўтаномнай рэспублікі паведамляюць інфармагенцтвы. На бок крымскага народа, як паведамляецца, перайшлі 800 вайскоўцаў. Усяго на аэрадроме ў Бельбеке, як паведамляецца, знаходзяцца 45 знішчальнікаў і чатыры вучэбныя самалёты, але спраўныя з іх толькі чатыры МіГ-29 і адзін Л-39. Раней крымскія ўлады паведамлялі, што пад іх кіраўніцтва, пачынаючы з 2 сакавіка, перайшлі больш за пяць тысяч ваеннаслужачых унутраных войскаў, дзяржаўнай памежнай службы і ўзброеных сіл Украіны. На вернасць крымскаму народу, паводле заяў рэспубліканскага кіраўніцтва, прысягнулі ў тым ліку зенітна-ракетныя палкі ў Еўпаторыі і Феадосіі. Прэм'ер Крыма Сяргей Аксёнаў напярэдадні, 2 сакавіка, абвясціў аб стварэнні на паўвостраве ўласных ваенна-марскіх сіл. Новае фарміраванне ўзначаліў былы камандуючы ВМС Украіны Дзяніс Беразоўскі, які прысягнуў на вернасць крымскаму народу (за гэта Генпракуратура краіны завяла на яго справу аб дзяржаўнай здрадзе). Пасля адхілення Віктара Януковіча ад пасады прэзідэнта Вярхоўнай Радай Крым адмовіўся прызнаваць легітымнасць новага кіеўскага кіраўніцтва. Аксёнаў звярнуўся да прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна па дапамогу ў забеспячэнні міру ў рэгіёне.

### МІТЫНГОЎЦЫ ЎВАРВАЛІСЯ Ў АБЛСАВЕТ АДЭСЫ




Учора каля будынка адэскай абласной адміністрацыі быў арганізаваны мітынг праціўнікаў новай украінскай улады. Група мітынгоўцаў прарвалася ўнутр, паведамляе «Таймер». Як перадае «Рэпарцёр», у зале, дзе праходзіла пасяджэнне абласнога савета, адбылася бойка. Лідар прарасійскай арганізацыі «Моладзевае адзінства» Антон Давідчанка, як паведамляе «Вікна-Одеса», абвясціў патрабаванні да дэпутатаў. Ім было прапанавана часова ўзяць на сябе ўсю паўнату ўлады ў рэгіёне («каб разумець, хто ў рэгіёне адказны за парадак»), прыняць у сваё падпарадкаванне сілавыя структуры рэгіянальнага ўзроўню — упраўленне ўнутраных спраў, пракуратуру, упраўленне Службы бяспекі Украіны. «Мы не за раскол Украіны. Але мы маем патрэбу ў тэрытарыяльнай адміністрацыйнай рэформе», — адзначалася ў заяве мітынгоўцаў. Удзельнікі мітынгу таксама заклікалі правесці рэферэндум аб асаблівым статусе Адэскай вобласці. Прарасійскія акцыі, удзельнікі якіх выказвалі недавер новай украінскай уладзе, на днях прайшлі і ў іншых абласных цэнтрах: Данецку, Харкаве і Луганску. Мітынгі суправаджаліся штурмам абласных адміністрацый. У Данецку пры гэтым мітынгоўцы выбралі «народнага губернатара» і выступілі за правядзенне рэферэндуму «пра далейшы лёс Данбаса».

### НАМЕСНІК ГЕНЕРАЛЬНАГА САКРАТАРА ААН НАКІРАВАНЫ ВА УКРАІНУ ДЛЯ АЦЭНКІ СІТУАЦЫІ

Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун прыняў рашэнне накіраваць свайго першага намесніка Яна Эліясана ва Украіну. Пра гэта гаворыцца ў заяве кіраўніка сусветнай арганізацыі, з якой выступіў яго прэс-сакратар. У час знаходжання ва Украіне Ян Эліясан правядзе ацэнку сітуацыі на месцах і пасля праінфармуе генеральнага сакратара аб наступных кроках, якія арганізацыя можа зрабіць для падтрымкі намаганняў па паслабленні напружанай сітуацыі ў краіне.

ISSN 1990 - 763X

14040

9 771990 763008

## КОРАТКА

Саветам кіраўнікоў дзяржаў СНД у рабочым парадку прыняты план асноўных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і святкаванні 70-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў.

У Беларусі на 1000 мужчын прыпадае 1151 жанчына. Прычым у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу на 1000 мужчын прыпадае 1166 жанчын, у сельскіх населеных пунктах — 1102 жанчыны. Паводле звестак дэмаграфічнай статыстыкі, на пачатак гэтага года налічваецца 5,1 млн жанчын, або 53,5% ад агульнай колькасці насельніцтва. У гарадах і пасёлках гарадскога тыпу пражываюць 77,3% жанчын, у сельскіх населеных пунктах — 22,7%.

Беларускія пункты пагранічнага пропуску на граніцы з Украінай працуюць у штатным рэжыме, і ніякія дзеянні па закрыцці або блакіраванні не прымаліся. Колькасць грамадзян, якія перасеклі пункты пропуску на беларуска-ўкраінскай граніцы ў лютым 2014 года, прыкладна на 27% менш у параўнанні з леташнім.

У Беларусі пачасціліся выпадкі маскіроўкі паслуг таксі пад выглядам іншай камерцыйнай дзейнасці, якая таксама мае адносіны да перавозак пасажыраў.

## ГУКАЦЬ ДЫК ГУКАЦЬ!..

**Самая вялікая Зіма-Марэна была спалена падчас святкавання Масленіцы на тэрыторыі Дзяржаўнага музея архітэктуры і побыту пад Мінскам. Небывалая колькасць наведвальнікаў, гасцей і ўдзельнікаў першага веснавога свята пабіла ўсе леташнія рэкорды.**

Магчыма, прычынай гэткай шматлюднасці стала загадзя абвешчанае абрадавае дзеянне з Паазер'я «Пахаванне бабы» і заяўленыя на ўдзел у забаўляльнай праграме «фаер-шоу» і адразу некалькі вядомых фальклорных і вакальна-інструментальных гуртоў. Весела пляскалі ў далоні і кідаліся ў скокі пад вясёлыя спевы і найгрышы гарманістаў з «Асалоды» Барысаўскага раёна, «Медуніцы» з Мінскай школы № 11, вясёлага гурта з Ратамкі, сталічнага гурта «Рэха».

СТАР. 4



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ:

# «НЕ БУДЗЬЦЕ АБЫЯКАВЫМІ ДА ВЫБАРАЎ»

**У грамадскай арганізацыі «Белая Русь» ужо стала традыцыяй два разы на месяц прымаць гасцей з рэгіёнаў у галоўным офісе. На гэты раз прыехала дэлегацыя з Рэчыцы. Менш за ўсё сустрэча была падобная на афіцыйнае мерапрыемства: абмен думкамі, жарты і нават песні... Старшыня РГА «Белая Русь», першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр РАДЗЬКОЎ заўважыў, што арганізацыя аб'ядноўвае, перш за ўсё, аднадумцаў, людзей, у якіх адзіная мэта — як мага больш зрабіць для народа і дзяржавы.**

Паколькі з Рэчыцы прыехала шмат гасцей і за авальным сталом усім месца не хапіла, сама сабой узнікла думка пра неабходнасць новай штаб-кватэры, бо ўжо цеснавата. «Але патрэбны не столькі новы офіс, — адзначыў Аляксандр Радзькоў, — колькі грамадская прыёмная, куды людзі змогуць прыходзіць са сваімі праблемамі і прапановамі. Улада павінна ведаць, як жыве народ».

У гутарцы з рэчыцкай дэлегацыяй былі закрануты розныя тэмы — ад сур'ёзных эканамічных і палітычных, у тым ліку будучых выбараў у мясцовыя саветы, да культурных.

Старшыня «Белай Русі» падкрэсліў, наколькі важна, каб народ прыйшоў галасаваць. Абыякавасць вядзе ў тым ліку і да трагічных падзей, чаму ўсе мы былі сведкамі на прыкладзе суседняй краіны.

Таксама старшыня арганізацыі звярнуў увагу на тое, што не заўсёды рашэнні, якія прымае ўлада, бываюць папулярнымі ў народзе, але без гэтага няма руху. «Калі ёсць неабходнасць у такіх рашэннях, трэба ісці да людзей і тлумачыць ім», — заявіў Радзькоў.

**Святлана БАДЗЮЛЯ, старшыня Рэчыцкай раённай арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь»,** паведаміла, што сёння ў іх налічваецца 1 137 членаў, аб'яднаных у 58 пярвічных арганізацый. Прыкладна 40% усіх удзельнікаў — педагогі і работнікі ўстаноў адукацыі, 25% — спецыялісты прамысловых прадпрыемстваў, 11% — работнікі сельскай гаспадаркі. «Наша арганізацыя расце, у тым ліку, за кошт моладзі, — заўважыла Святлана Бадзюля. — Сярод членаў нашага аб'яднання 13% — маладыя людзі ва ўзросце да 30 гадоў». Таксама Бадзюля адзначыла, што раённая арганізацыя «Беларя Русь» прымае актыўны ўдзел у розных акцыях, накіраваных на падтрымку інстытута сям'і. «У рамках дабрачыннай акцыі «Белая Русь — дзецям» мы арганізуем мерапрыемствы, якія маюць вялікае значэнне для рэалізацыі права дзіцяці на шчаслівае жыццё ў сям'і, — паведаміла яна. — Мы адкрылі два дзіцячыя дамы сямейнага тыпу — адзін у раёне і адзін у горадзе. Сёння ў гэтых сем'ях выхоўваецца 17 дзяцей».

Па словах Святланы Бадзюлі, раённая арганізацыя таксама імкнецца клапаціцца аб дзецях з асаблівасцямі развіцця. «У Рэчыцы ёсць школа-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў і цэнтр карэкцыйнага развіцця і рэабілітацыі. Штогод мы наведваем гэтыя ўстановы з падарункамі і віншаваннямі напярэдадні свят».

Пасля сустрэчы гасцей з Рэчыцы запрасілі на... Камароўскі рынак: на плошчы каля яго была арганізавана акцыя «Галасуй, сталіца».

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

# АРХІТЭКТАР ПАЧУЦЦЯЎ



**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным і калегам старшыні Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын, лаўрэата Ленінскай прэміі, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, заслужанага архітэктара Беларусі, аднаго з аўтараў дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» Леаніда Левіна ў сувязі з яго смерцю.**





Мемарыял «Чырвоны Бераг» на месцы дзіцячага канцлагера.

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

Леаніда Мендэлевіча Левіна ведае кожны жыхар нашай краіны. І не толькі таму, што ён быў вядомым архітэктарам, лаўрэатам самых высокіх прэмій, перакананым антыфашыстам. Без створанага Леанідам Левіным сучасную Беларусь уявіць наогул, здаецца, немагчыма. Бо ці была б у нас памяць пра мінулую вайну такой пранізліва-балючай, ці было б перакананне, што гэта не павінна больш паўтарыцца, такім цвёрдым і адназначным, калі б не Хатынь, не «Яма» на месцы Мінскага гета, не мемарыяльны комплекс на месцы дзіцячага канцлагера ў Чырвоным Беразе пад Жлобінам, не помнік мужнасці «Прарыў» недалёка ад Ушачаў?.. Ці мела б наша сталіца сёння тое архітэктурнае аблічча, якому здзіўляюцца прыезджыя і якім ганарымся мы, калі б Леанід Левін у свой час не спраектаваў будынкі гарвыканкама і ВДНГ, станцыі метро «Плошча Леніна» і «Няміга», не прымаў актыўны ўдзел у рэканструкцыі Траецкага і Ракаўскага прадмесцяў, Верхняга горада, забудовы старажытнай Нямігі, не стварыў праект дэтальнай планіроўкі і забудовы цэнтра Мінска і цяперашняга праспекта Пераможцаў?.. Ён быў сапраўдным мастаком, бо здолеў даступнымі яму сродкамі выяўлення перадаць тое, што аплакваў, што адчуваў, пра што марыў.

Ён быў нібы асабіста знаёмы кожнаму з нас. Бо праз тое, што рабіў, спрабаваў дастукацца да нашага розуму і пачуццяў. І яму гэта, несумненна, удалося.

# ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ НАШ ДЗЯДЗЬКА РЫГОР



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рыгор Барадулін

**Неба над мамінай хатай**

*Дагарэла нейчая душа —*
*Знічка рассыпаецца імкліва...*
*Не ўтрымаўшы зорнага каўша,*
*Зорнае млынар рассыпаў мліва...*
*Павуціння зорнага імжа...*
*Зорнага іржышча рабаціннe...*
*Куфра змроку зорная іржа...*
*Зорнай лесапільні пілавінне...*

2 сакавіка пасля цяжкай працяглай хваробы ва ўзросце 79 гадоў пайшоў з жыцця Народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін. Сябры і ўсе тыя, хто яго любіць, часта называлі паэта дзядзькам Рыгорам. І ён ніколі не пярэчыў. Наадварот — гэта набліжала яго да беларусаў, да самога народа, дзеля якога Барадулін ствараў усё сваё жыццё. Паэт пайшоў з жыцця ў Даравальную нядзелю. З такімі людзьмі, як Барадулін, выпадковасцяў не бывае.

Сышоў Барадулін, сышла цэлая эпоха… Наўрад ці ў беларускай літаратуры ёсць нехта, хто ўмеў бы абыходзіцца са словам так умела, як гэта рабіў Рыгор Іванавіч. Гэта быў паэт ад Бога, перакладчык ад Бога, даследчык слова ад Бога. Варта ўзгадаць хаця б тое, што ў 2006 годзе кандыдатура Рыгора Барадуліна была сярод намінантаў на Нобелеўскую прэмію па літаратуры за зборнік малітоўнай паэзіі «Ксты». Барадулін пераклаў на беларускую мову кнігу паэзіі Папы Рымскага Яна Паўла II «Рымскі трыпціх», п'есу «Вей, ветрык!» Яна Райніса (1980), «Ветраліст» Габрыелы Містраль (1986), творы Шэкспіра, Неруды, Міцкевіча, Ясеніна, Федэрыка Гарсія Лоркі ды іншых сусветна вядомых паэтаў. Наогул Барадулін аўтар больш за 70 зборнікаў паэзіі.

Рыгор Барадулін быў майстрам нечаканых метафар і алітэрацый. Яго паэтычны радок «лілею млявы плёс люляе…» з'яўляецца адным з самых сакавітых прыкладаў алітэрацыі ў беларускай літаратуры. А яго «Паэма» пра каханне («Мне цябе нестае/Тае…») з'яўляецца, напэўна, самай запамінальнай, арыгінальнай і трапнай паэмай пра пачуцці мужчыны і жанчыны.

Яго творчая і жыццёвая энергія была настолькі ўсёабдымная, што цяжка знайсці галіну літаратуры, у якой не працаваў бы дзядзька Рыгор: паэзія, пераклады, дзіцячая літаратура. Літаральна некалькі гадоў таму выйшла кніга Барадуліна «Выпаў грук у грома з рук» — зборнік вершаў, загадак і скорагаворак для дзяцей. Што можа быць лепей, каб прывучыць дзіця да беларускай мовы, чым дынамічныя, вясёлыя і дасціпныя вершы Рыгора Барадуліна!

А яго «Вушацкі словазбор»! Яго даследаванні мясцовай гаворкі (Барадулін нарадзіўся на Ушаччыне на хутары), з якой столькі слоў-знаходак ён пазычыў для сваіх вершаў. Яго далікатнае стаўленне да маці, яе спеваў і жыццёвай мудрасці таксама займелі сваё адлюстраванне ў творчасці паэта. «Чую, як мама песню плача…»

Сяброўства з Караткевічам і Быкавым — сапраўднае мужчынскае сяброўства сапраўдных творцаў. Перапіска Барадуліна і Быкава ператварылася ў кнігу «Калі рукаюцца душы…» І больш шчымлівую празаічна-паэтычную сяброўскую перапіску цяжка знайсці.

А славутае пачуццё гумару дзядзькі Рыгора настолькі заражальнае і трапнае, што яму ўдавалася пісаць непараўнальна дасціпныя вершы на злобу дня, жартаўлівыя вершы пра мужа ды жонку і нават сяброўскія і не вельмі эпіграмы.

Цяжка паверыць у гэтую страту, у тое, што дзядзька Рыгор больш не напіша шчымлівага верша пра Радзіму або малітоўна-шчырага пра веру і каханне, або жартаўлівага — пра пеўня… Што мы можам цяпер толькі перачытваць паэтаву спадчыну і спрабаваць зразумець, асэнсаваць, не забыць…

***Развітанне з Народным паэтам Беларусі Рыгорам Іванавічам Барадуліным адбудзецца сёння, 4 сакавіка, у Чырвоным касцёле ў Мінску. Пахаваюць яго ў беларускай вышыванцы на Ушацкіх могілках побач з мамай. Так, як ён хацеў.***

# «ПРЫСУТНІЧАЦЬ У ЕЎРОПЕ І ПАЛІТЫЧНА...»

**Еўрапейскія партнёры паступова прыходзяць да разумення таго, што неабходна супрацоўнічаць з Беларуссю. Аб гэтым тэлеканалу «Беларусь 1» заявіў міністр замежных спраў Уладзімір Макей.**

«Мы гатовы да адкрытага, шчырага, раўнапраўнага дыялогу з Еўрапейскім саюзам. Мне здаецца, што нашы еўрапейскія партнёры паступова прыходзяць да разумення таго, што неабходна ўсё ж такі супрацоўнічаць, весці дыялог адзін з адным, неабходна супрацоўнічаць у тых сферах, дзе гэта можна і выгадна і для Беларусі, і для Еўрапейскага саюза. У гэтым кантэксце мы вялі размовы і падчас майго візіту ў Латвію і Літву 27 лютага — 1 сакавіка. Гаварылі, у прыватнасці, аб удзеле Беларусі ва «Усходнім партнёрстве», — сказаў Уладзімір Макей.

На думку кіраўніка ведамства, неабходна вызначыцца, што важна для Еўропы. «Еўропе важна мець Беларусь як суверэнную, незалежную, тэрытарыяльна цэласную дзяржаву, якая ўносіць свой уклад у забеспячэнне еўрапейскай стабільнасці і бяспекі. Беларусь павінна быць астраўком стабільнасці і бяспекі з пункту гледжання Еўропы. Давайце паставім гэту мэту і будзем рухацца да гэтай мэты», — падкрэсліў міністр.

«Мы знаходзімся геаграфічна ў Еўропе. Але мы павінны прысутнічаць у Еўропе не толькі геаграфічна, але і палітычна, і гандлёва-эканамічна».

**БЕЛТА.**

■ Конкурс

# ПАШТОЎКІ ДЛЯ ГАСЦЕЙ ЧС-2014

**Памятныя паштоўкі, якія будуць створаны на аснове дзіцячых малюнкаў, плануецца выпусціць да ЧС-2014. Аб гэтым паведаміла першы намеснік міністра інфармацыі, старшыня журы культурна-адукацыйнага праекта (конкурсу) «Дзеці малююць хакей» Лілія Ананіч на фінальным этапе гэтага конкурсу дзіцячых малюнкаў, перадае БЕЛТА.**

«Мэта конкурсу — папулярызацыя хакея ў прыватнасці і спорту ў цэлым, здаровага ладу жыцця, любові да Радзімы. Акрамя таго, работы конкурсу сімвалізуюць тое, як мы ўсе рыхтуемся да маючага адбыцца чэмпіянату. Лепшыя работы будуць выстаўлены ў фан-зонах спаборніцтваў, і на іх аснове будуць выпушчаны памятныя паштоўкі еўрафармату», — расказала Лілія Ананіч.



Фота БЕЛТА.

Як растлумачыла старшыня журы, плануецца, што для выставы будзе адабрана каля 50 работ, а на аснове 20 лепшых малюнкаў будуць створаны паштоўкі. Чакаецца таксама, што з адваротнага боку паштовак будзе размешчана інфармацыя аб беларускіх хакеістах. Усяго на конкурс паступіла 452 малюнкі. Конкурс праходзіў ва ўзроставых катэгорыях 7-11 гадоў і 12-16 гадоў. У малодшай узроставай групе лепшай работай быў прызнаны малюнак «На лёдзе» выхаванкі дзіцячай школы выяўленчых мастацтваў горада Крычаў Паліны Майсеенка. Першае месца сярод вучняў другой узроставай групы заняла работа «Я веру ў цябе, хакеіст Беларусі!» вучаніцы народнай выяўленчай студыі «Вытокі» (Слуцк) Інгі Адзярыха.

■

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі з раптоўнай смерцю рэктара Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара тэхнічных навук, прафесара, заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь КУХАРЧЫКА Пятра Дзмітрыевіча і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.**

**Республиканский Совет Республиканского общественного объединения «Белая Русь» выражает соболезнования родным и близким скоропостижно скончавшегося известного белорусского ученого-радиофизика, общественного деятеля и педагога, члена-корреспондента Национальной академии наук Беларуси, доктора технических наук, профессора, ректора Белорусского государственного педагогического университета им. М. Танка, члена Республиканского Совета РОО «Белая Русь» КУХАРЧИКА Петра Дмитриевича.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» смуткуе з нагоды раптоўнай смерці рэктара Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара тэхнічных навук, прафесара, заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь КУХАРЧЫКА Пятра Дзмітрыевіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Калектыў выдавецтва «Мастацкая літаратура» смуткуе ў сувязі са смерцю свайго былога супрацоўніка, народнага паэта Беларусі Рыгора Іванавіча БАРАДУЛІНА і выказвае глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.**

■ Блізкая ўлада

# НОВЫЯ ВЫКЛІКІ ЧАСУ

**Уладзімір КРАЎЦОЎ, адпрацаваўшы 100 дзён на пасадзе старшыні Гродзенскага аблвыканкама, правёў першую прэс-канферэнцыю для журналістаў раённых, абласных і рэспубліканскіх СМІ. Вось якія думкі ён выказаў па шэрагу актуальных пытанняў жыцця рэгіёна.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

## Мадэрнізацыя без кампанейшчыны

— Летась у эканоміцы вобласці не ўсё з намечанага ўдалося выканаць, але па большасці параметраў забяспечана станоўчая дынаміка. Разам з тым ёсць і праблемы. Найбольш складанае становішча цяпер на прадпрыемствах, што пастаўляюць сваю прадукцыю машынабудаўнічым гігантам (МТЗ, МАЗ, БелАЗ), у якіх ёсць цяжкасці з рэалізацыяй тэхнікі. Таму трэба працаваць не толькі на зборачныя канвееры, але і мець іншыя віды прадукцыі, каб «манеўраваць» у складаны час са збытам асноўных вырабаў.

Мадэрнізацыя — гэта патрабаванне часу, і тут не павінна быць нейкай кампанейшчыны. Асабліва чуйна да запытаў рынку ставяцца на прадпрыемствах буйнога прыватнага бізнесу (кампаніі «ЗОВ», «Контэ Спа», «Біяком»), дзе хутка ўкараняюць усё самае передавое. Паспяхова мадэрнізуюцца, выраблячы новыя віды прадукцыі і пашыраючы сваю прысутнасць на рынках, гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман», прадпрыемствы «Лідсельмаш» і «Лідахлебапрадукт». А прыкладам граматнага падыходу да мадэрнізацыі цэлай галіны, што адбывалася пад кантролем органаў улады, з'яўляецца мяса-малочная прамысловасць. У выніку леташні экспарт гэтых тавараў дасягнуў 680 мільёнаў долараў, і можна разлічваць на большае, бо практычна на кожным прадпрыемстве ёсць інвестыцыйны праект па далейшым развіцці.

Вынікі перапрацоўшчыкаў, зразумела, наўпрост звязаны з працай аграрнікаў вобласці, якія летась упершыню перавысілі 1 мільён тон валавой вытворчасці малака. Гэта вынік маштабнай праграмы па будаўніцтве новых і рэканструкцыі пад сучасныя тэхналогіі старых фермаў. Задача — павысіць эфектыўнасць галіны і атрымаць аддачу ад вялізных затрат на яе мадэрнізацыю. Аднак новыя тэхналогіі патрабуюць кадравага патэнцыялу, а з ім пакуль праблематычна.

## Цывілізаванае стаўленне да інвестараў

— Сярод найбольш значных інвестыцыйных праектаў з удзелам замежнага капіталу — будаўніцтва ў Смаргоні дрэваапрацоўчай вытворчасці аўстрыйскай кампаніяй «Кронаспан», стварэнне ў Лідскім раёне комплексу па прамысловай вытворчасці мяса індычкі літоўскай кампаніяй ARVI. Акрамя таго, у Ваўкавыску будзе пабудаваны завод па вытворчасці фруктовых напаўняльнікаў, а ў Шчучыне — прадпрыемства па перапрацоўцы сыроваткі і выпуску сыроватачна-тлушчавага канцэнтрату. Пры гэтым укараняюцца самыя сучасныя тэхналогіі.

Да інвестараў і ўвогуле прадстаўнікоў бізнесу трэба ставіцца цывілізавана, не прад'яўляючы занадта вялікіх патрабаванняў, пакуль яны не развіліся. Пры гэтым не павінна быць так, што аб'ект і дзяржаўным уласнікам не выкарыстоўваецца, і для арганізацыі нейкай вытворчасці не перадаецца.

Дарэчы, замежныя інвестыцыі ў самыя розныя сферы (напрыклад, у інфраструктуру турызму) можна прыцягнуць і дзякуючы праграмам транспрагранічнага супрацоўніцтва. Трэба толькі «паварушыцца» і распрацаваць канкурэнтаздольны праект.

## «Пратэрмінаваных» дамоў быць не павінна

— Летась на Гродзеншчыне ўведзена ў эксплуатацыю 655 тысяч квадратных метраў жылля — на чвэрць больш, чым у папярэднім годзе. Сярэдні кошт 1 квадратнага метра агульнай плошчы кватэр, пабудаваных з выкарыстаннем дзяржпадтрымкі, самы нізкі ў краіне — 5,1 мільёна рублёў. План будаўніцтва жылля на сёлетні год — 660 тысяч квадратных метраў.

Да канца мінулага года ў вобласці разабраліся з усімі жылымі дамамі, якія будаваліся з перавышэннем нарматыўнага тэрміну, і цяпер галоўнае, каб такіх праблемных сітуацый больш не ўзнікала. На гэта скіравана новая сістэма жыллёвага будаўніцтва на дзяржаўны заказ, якая павінна садзейнічаць жорсткаму кантролю за коштам квадратнага метра і своечасовым уводам дамоў у эксплуатацыю. Сёлета на дзяржзаказ на Гродзеншчыне запланавана пабудаваць 43 шматпавярховыя дамы. Згодна з цывілізаваным еўрапейскім досведам, пашырыцца практыка арэнднага жылля — з'явяцца 14 дамоў з такімі кватэрамі. Павінна павялічвацца і будаўніцтва індывідуальных дамоў, для чаго людзям трэба выдзяляць зямлю, дапамагаць з крэдытамі. Пры гэтым, што датычыцца абласнога цэнтра, трэба выкарыстоўваць нармальную еўрапейскую практыку гарадоў-спадарожнікаў. Для Гродна ім мог бы стаць, напрыклад, Скідаль.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Раней тэрміну

# Бярозавік пайшоў!

**Лясгасы краіны павінны аператыўна рыхтавацца да нарыхтоўкі бярозавіку: у сувязі з цёплым надвор'ем у паўднёвых рэгіёнах Беларусі ўжо на мінулым тыдні пачаўся рух кляновага і бярозавага соку, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Спецыялісты адзначаюць, што не могуць прыгадаць гадоў, калі сокарух пачынаўся б у лютым. Звычайна першыя падсочкі праводзяцца ў 20-х чыслах сакавіка. Ці, наадварот, запомніўся сезон мінулага года, калі з-за зімы, якая зацягнулася, сокарух у бяроз пачаўся анамальна позна (у сярэдзіне красавіка) і вельмі хутка скончыўся. Лясгасам тады ўдалося нарыхтаваць толькі 14,8 тысячы тон бярозавіку — 55,8% да ўзроўню папярэдняга года.

Сёлета, як бачым, усё склалася зусім па-іншаму. Таму лясгасы раней, чым звычайна, і аператыўна рыхтуюцца да прамысловай нарыхтоўкі соку: афармляецца дакументацыя, заключаюцца дагаворы з прадпрыемствамі-перапрацоўшчыкамі, рыхтуецца неабходная тэхніка і тара.

Першымі да нарыхтоўкі бярозавіку прыступаюць лясгасы Брэсцкай і Гомельскай абласцей, потым да іх далучацца і астатнія гаспадаркі краіны. Для спрыяльнай нарыхтоўкі соку аптымальная сярэднясутачная тэмпература павінна складаць 5–10 градусаў вышэй за нуль. Пры начных замаразках сокарух спыняецца, як і пры тэмпературы вышэй за плюс 10 градусаў, калі хутка распускаецца лісце.

Арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі прымуць усе меры для нарыхтоўкі той колькасці соку, якая неабходная для задавальнення патрэб перапрацоўчых камбінатаў і насельніцтва. Пры магчымасці, бярозавік будзе і экспартавацца. У мінулыя гады, да прыкладу, гэты прыродны напой быў няблага запатрабаваны на літоўскім рынку.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# Падарыць дзецям сям'ю

**Для іншых дзяцей 8 Сакавіка — звычайнае свята. Толькі не для гэтых. Для іх, былых сірот, жаночы дзень не проста свята, а шчасце — павіншаваць маму. І яны, вядома, разам з татам прыдумаюць для яе сюрпрызы і скажуць самыя цёплыя словы віншаванняў. А 26 лютага віншавалі іх, жыхароў новага дома сямейнага тыпу — першы ў Ганцавіцкім раёне, урачыста адкрылі ў аграгарадку Агарэвічы.**

Бацькі-выхавацелі Надзея і Абдзігапар Ерназаравы прымалі падарункі ад гасцей і спонсараў. Была і перадача будаўнікамі сімвалічнага ключа, і пераразанне стужкі ганаровымі гасцямі, і шмат цукерак для дзяцей. Але галоўнае, што ў гэтым доме пасялілася цеплыня, — пераканана загадчыца сектара аховы дзяцінства Ганцавіцкага аддзела адукацыі Наталля Валасюк. Наталля Мікалаеўна даўно ведае гэтую вялікую сям'ю і лічыць, што муж і жонка вельмі добра падыходзяць для ролі бацькоў.

Абдзігапар родам з Казахстана. Служыў тут у войску і закахаўся ў беларускую дзяўчыну. У сужэнцаў шасцёра сваіх дзяцей. Пры гэтым трое — дарослыя, жывуць асобна, а трое малодшых — дашкольнага і школьнага ўзросту. Ерназаравы жылі да гэтага часу ў Ганцавічах. Год таму яны ўзялі ў сваю кватэру дваіх прыёмных дзяцей. Цяпер з пераездам у новы дом сям'я папоўнілася яшчэ трыма дзецьмі. З часам бацькі плануюць узяць яшчэ некалькі хлопчыкаў і дзяўчынак.

Новы двухпакаёвы катэдж для вялікай сям'і пабудавалі за сродкі Беларусбанка. На будаўніцтва выдаткавана больш за чатыры мільярды рублёў. Мэблю, бытавую тэхніку набывалі за кошт спонсараў і сродкаў раённага бюджэту.

Дом сямейнага тыпу ў Агарэвічах — 32-і ў вобласці. У такіх дамах знайшлі бацькоўскі клопат і цеплыню больш за 200 хлопчыкаў і дзяўчынак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЧАСОВА ПРЫПЫНЕНЫ ПАКАЗ АМАЛЬ 20 ЗАМЕЖНЫХ ТЭЛЕКАНАЛАЎ

У Беларусі з 1 сакавіка часова прыпынены паказ амаль 20 тэлеканалаў у сувязі з адсутнасцю дазволаў на іх трансляцыю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, паведамляе БЕЛТА. Атрымаць падаўжэнне ліцэнзіі не паспелі RTVi, «Наша любімае кіно», Discovery chanel, Sony Entertainment, Sony SCI-FI, TLC, Sony turbo, Discovery World, Animal Planet, Mezzo, «Шансон ТБ» і некаторыя іншыя каналы. Як паведамляецца на сайце «Космас ТБ», у якасці кампенсацыі ўсім абанентам лічбавага кабельнага тэлебачання адкрыюць паказ усіх дадатковых пакетаў і HD каналаў.

У кампаніі адзначылі, што працэс атрымання дазволаў прадаўжаецца. Як толькі праграмадаўцы прадаставяць неабходны пакет дакументаў для падачы ў Міністэрства інфармацыі, трансляцыя каналаў будзе адноўлена.


**ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ**

Покупатель акций — Луконин Владимир Евгеньевич, проживающий по адресу: г. Минск, ул. Светлая 13-1, тел. **+37529 6227890,** сообщает о намерении приобрести простые (обыкновенные) акции открытого акционерного общества «Мясомолмонтаж», расположенного по адресу: 220007, г. Минск, ул. Артиллеристов, 8.

Количество приобретаемых акций – 25000 (Двадцать пять тысяч) штук.

Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции: от 48 700 до 110 000 (от сорока восьми тысяч семисот до ста десяти тысяч) белорусских рублей за одну акцию.

Срок, форма и порядок оплаты акций — оплата производится путем безналичного перечисления денежных средств через расчетно-клиринговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в день заключения сделки.

Адрес, по которому будет совершаться покупка акций: ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, д. 48а.

Брокер покупателя акций — закрытое акционерное общество «БРОСТОК», адрес: 220036, г. Минск, переулок Домашевский, 11А, ком. 712, 713, тел. (017)2135859.

Дата начала покупки акций: 12 марта 2014 года.

Дата окончания покупки акций: 1 сентября 2014 года.

Считать ранее поданное мною объявление в газете «Звязда» от 28.02.14 о намерении купить акции открытого акционерного общества «Мясомолмонтаж», расположенного по адресу: 220007, г. Минск, ул. Артиллеристов, 8, недействительным на основании не соответствия законодательству РБ о ценных бумагах.

**ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ**

Покупатель акций — Мозгов Александр Владимирович, проживающий по адресу: г. Минск, ул. Ландера, д. 8, кв. 12, тел. (029) 650 74 70, сообщает о намерении приобрести простые (обыкновенные) акции открытого акционерного общества «Мясомолмонтаж», расположенного по адресу: 220007, г. Минск, ул. Артиллеристов, 8.

Количество приобретаемых акций — 10000 (Десять тысяч) штук.

Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции: от 48 700 до 110 000 (от сорока восьми тысяч семисот до ста десяти тысяч) белорусских рублей за одну акцию.

Срок, форма и порядок оплаты акций — оплата производится путем безналичного перечисления денежных средств через расчетно-клиринговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в день заключения сделки.

Адрес, по которому будет совершаться покупка акций: ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, д. 48а.

Брокер покупателя акций — закрытое акционерное общество «БРОСТОК», адрес: 220036, г. Минск, переулок Домашевский, 11А, ком. 712, 713, тел. (017)2135859.

Дата начала покупки акций: 12 марта 2014 года.

Дата окончания покупки акций: 1 сентября 2014 года.

Считать ранее поданное мною объявление в газете «Звязда» от 28.02.14 о намерении купить акции открытого акционерного общества «Мясомолмонтаж», расположенного по адресу: 220007, г. Минск, ул. Артиллеристов, 8, недействительным на основании не соответствия законодательству РБ о ценных бумагах.


Дарэвалюцыйны фотаздымак Віцебска (бераг Заходняй Дзвіны).

■ Дзеля памяці

# ЗАПОМНІЦЬ ТЫЯ БЕРАГІ...

## Навукоўцы і краязнаўцы запланавалі ажыццявіць экспедыцыю па даследаванні рэчышча Заходняй Дзвіны, перад тым як вада назаўсёды схавае ўнікальныя краявіды



**Вядома, што ў выніку запуску каскада ГЭС на адной з самых галоўных рэк не толькі Беларусі, але і Еўропы рэчышча назаўсёды зменіцца. Удзельнікі экспедыцыі гатовы супаставіць гістарычныя і геаграфічныя звесткі, зрабіць фота- і відэаздымку значных прыродных і гістарычных аб'ектаў, ажыццявіўшы адначасова іх дакладную геаграфічную прывязку. Гэта дасць унікальную магчымасць сабраць найбагацейшы матэрыял краязнаўчага характару і захаваць для будучых пакаленняў сучаснае аблічча Заходняй Дзвіны. Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з адным з аўтараў ідэі правядзення экспедыцыі Дзянісам ЮРЧАКОМ, намеснікам дэкана гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава.**

***— Дзяніс Валер'евіч, перад нашай сустрэчай вы гаварылі пра тое, што падчас экспедыцыі група аднадумцаў паспрабуе працягнуць справу вядомага далёка за межамі Віцебшчыны краязнаўца Аляксея Сапунова...***

— Рабочая назва будучай экспедыцыі — «Дзвіна А. П. Сапунова». Сам Аляксей Парфенавіч Сапуноў вядомы як летапісец Віцебшчыны. У сваім унікальным даследаванні «Рака Заходняя Дзвіна» Сапуноў разгледзеў ролю ракі ў гісторыі Віцебшчыны і іншых рэгіёнаў, размешчаных уздоўж яе берагоў, прывёў падрабязнае апісанне вытоку і шматлікіх прытокаў, змясціў геалагічны нарыс берагоў Дзвіны, вывучыў развіццё суднаходства на рацэ, спецыфіку рыбнай лоўлі. Асаблівую ўвагу аўтар надаваў падрабязнаму апісанню самой ракі: яе шырыні і глыбіні, хуткасці плыні. У дэталях апісваюцца парогі, мелі, выспы і буйныя валуны ў рэчышчы ракі. Такая інфармацыя ўнікальная сама па сабе і дае нам магчымасць у дэталях уявіць, як выглядала Заходняя Дзвіна больш як 100 гадоў таму.

***— Аднак з цягам часу аблічча апісанай Сапуновым Дзвіны істотна змянілася.***

— Абумоўлена гэта як прыродным фактарам: змяненнем фарватару, размываннем выспаў, падмываннем берагоў і г.д., так і антрапагенным. Варта прызнаць, што ў першую чаргу менавіта дзейнасць чалавека прывяла да змены аблічча берагоў. Ачыстка рэчышча ракі для суднаходства аказвала ўплыў на размяшчэнне фарватару і г.д.

Змянялася Дзвіна і па прычыне развіцця гідраэнергетыкі. Будаўніцтва ў Латвіі каскада ГЭС (Плявінская, Рыжская, Кегумская) прывяло да таго, што пershародную раку мы цяпер можам толькі ўяўляць дзякуючы старым фотаздымкам і кнізе Аляксея Сапунова.

На жаль, такі ж лёс можа чакаць і беларускі ўчастак ракі (328 з 1020 кіламетраў. — **Аўт.**). Гэта звязана з планамі актыўна развіваць гідраэлектраэнергетыку ў нашай краіне, што дазволіла б павялічыць долю таннай электраэнергіі ў агульным аб'ёме гадавога спажывання. У прыватнасці, на рацэ Заходняя Дзвіна прадугледжваецца стварэнне каскаду з чатырох ГЭС: Бешанковіцкай, Віцебскай, Полацкай і Верхнядзвінскай. На першым этапе будзе ўзведзена Полацкая ГЭС — яе плануюць здаць у эксплуатацыю ўжо ў 2015 годзе, а Віцебскую — у 2017 годзе.

***— Але ж нельга не пагадзіцца з тым, што прагрэс не спыніць. А адмовіцца ад танных крыніц электраэнергіі ва ўмовах пастаяннага ўзрастання патрэб таксама нельга.***

— Згодзен. Таму цяпер трэба думаць пра тое, што праз некалькі гадоў мы назаўжды страцім першароднае рэчышча Заходняй Дзвіны, вакол якой стагоддзямі цякло мернае жыццё нашых продкаў. Сучасныя тэхналогіі дазваляюць максімальна сабраць інфармацыю аб тым абліччы ракі, якое неўзабаве знікне. У першую чаргу, варта звярнуць асаблівую ўвагу на магчымасці фота- і відэафіксацыі берагоў ракі, валуноў і водмеляў, выспаў і ўнікальных для Беларусі парогаў, вядомых яшчэ з глыбокай старажытнасці сваім суровым норавам. Яны пасля павышэння ўзроўню вады і стварэння вадасховішчаў, згодна з заяўленым планам будаўніцтва, апынуцца на дне ракі... Таксама трэба вывучыць тыя месцы, дзе калісьці былі размешчаны прыстані і пераправы. Тут, дарэчы, можна весці гаворку аб неабходнасці комплекснай працы прафесійных дайвераў і археолагаў.

***— Што можа стаць вынікам такога падарожжа?***

— Я шчыра ўпэўнены, што экспедыцыю неабходна абавязкова арганізаваць для захавання аблічча ракі для нашчадкаў. Пажадана, каб у экспедыцыі ўзялі ўдзел спецыялісты розных сфер: гісторыкі, біёлагі, прафесійныя фатографы, дайверы, апаратары і гэтак далей. Вынікам магло б стаць стварэнне электроннага архіва матэрыялаў, які ўключае ў сябе тэкставую інфармацыю, фотаздымкі, відэаматэрыялы. На іх аснове ў перспектыве можна было б падрыхтаваць новыя геаграфічныя апісанні ракі, выдаць шэраг ілюстраваных альбомаў па Заходняй Дзвіне, падрыхтаваць відэафільм або цыкл перадач аб галоўнай воднай артэрыі Віцебшчыны. Акрамя таго, для папулярызацыі атрыманай інфармацыі можна было б шырока выкарыстоўваць інтэрнэт з дапамогай стварэння тэматычных сайтаў (напрыклад, віртуальнага музея Дзвіны) і груп у сацыяльных сетках, дзе таксама можа быць размешчана адпаведная інфармацыя.

***— Напэўна, задуманая вамі і вашымі аднадумцамі ўнікальная экспедыцыя — вельмі дарагое, так бы мовіць, «задавальненне»?***

— Галоўнай праблемай для арганізацыі такой экспедыцыі з'яўляецца фінансаванне. Было б добра, калі б знайшоўся спонсар, зацікаўлены ў праекце, тым больш што для яго гэта магло б стаць добрай піяр-акцыяй рэспубліканскага ўзроўню. Патрэбна не так ужо і шмат грошай, як гэта можа здацца на першы погляд. У першую чаргу, для даследавання ракі неабходна наяўнасць адпаведных плавальных сродкаў (прасцей арандаваных), а таксама выратавальнай амуніцыі і тэхнікі для фота- і відэафіксацыі. Вядома, падчас экспедыцыі могуць быць выкарыстаны відэакамеры, фотаапараты і нават лодкі саміх удзельнікаў экспедыцыі. Але варта ўлічваць, што далёка не ва ўсіх яны ёсць. Таму на падставе толькі адной грамадскай ініцыятывы разгарнуць падобны праект будзе вельмі складана. Аплату працы удзельнікаў экспедыцыі ніхто не патрабуе, хаця не перашкодзіла б наняць прафесійных апаратараў, бо сярод добраахвотнікаў такіх няма. Яшчэ мінулым летам мы разглядалі магчымасць сплаву разам з вядомым віцебскім краязнаўцам Міколам Піваварам. На шчасце, дзве лодкі «Уфімка» і байдарку мы знайшлі, гатовы былі плыць удвух, але па суб'ектыўных прычынах плаванне прыйшлося перанесці.

***— А якія яшчэ складанасці могуць узнікнуць падчас падрыхтоўкі да экспедыцыі?***

— Другой праблемай пры арганізацыі экспедыцыі можа стаць час. У першую чаргу, гэта тычыцца ўчастка затаплення ў раёне стварэння вадасховішча Полацкай ГЭС, увядзенне ў эксплуатацыю якой плануецца ў 2015 годзе. Таму на даследаванне ўчастка ад Віцебска да вёскі Лучна пад Полацкам, дзе і вядзецца будаўніцтва станцыі, застаецца не так шмат часу. А, улічваючы тое, што экспедыцыя можа быць арганізавана толькі па нізкай вадзе, калі ўсе парогі, водмелі, валуны і выспы не затоплены вадой, прайсці на гэтым участку Дзвіны магчыма толькі летам бягучага ці 2015 года, але пры спрыяльных прыродных умовах. Калі ж надвор'е не дазволіць гэтага зрабіць і вады будзе больш за мінімальны гадавы ўзровень, прыйдзецца задавольвацца толькі той магчымасцю па зборы матэрыялаў, якая будзе існаваць.

Што ж тычыцца Віцебскай ГЭС, то тут у распараджэнні ёсць значна больш часу — для даследавання ўчастка ракі ад расійскага Вяліжа да беларускага прыгарада Віцебска — пасёлка Лужасна. Але лепш было б правесці такую экспедыцыю за адзін год — на ўсім беларускім участку, а астатні час выкарыстоўваць для апрацоўкі і папулярызацыі атрыманай інфармацыі.

***— З чаго, на ваш погляд, трэба пачынаць падрыхтоўку да экспедыцыі?***

— Падрыхтоўка экспедыцыі павінна пачынацца з уважлівага вывучэння даследавання Сапунова і паэтапнага прывязвання наяўнай гісторыка-геаграфічнай інфармацыі да сучасных картаў. У выніку ўдзельнікі экспедыцыі будуць мець магчымасць выразна ўяўляць, што іх чакае на тым ці іншым участку ракі.

Асновай для перапрацоўкі інфармацыі могуць стаць здымкі рэчышча ракі, выкананыя з космасу і размешчаныя ў пошукавых інтэрнэт-сістэмах. Аналіз якасці ўжо размешчаных у інтэрнэце спадарожнікавых фотаздымкаў на ўчастку вышэй Віцебска паказвае, што ўсе яны выкананы летам, калі выдатна праглядваюцца ўсе выспы, водмелі, парогі — тыя аб'екты, якія знікнуць у сувязі з будаўніцтвам ГЭС. Але варта ўлічваць, што не ўсе ўчасткі ракі могуць быць прадстаўлены ў аднолькавай якасці ў розных вышуковых сістэмах. Таму мэтазгодна выкарыстоўваць адначасова некалькі варыянтаў спадарожнікавых здымкаў. Гэта дазволіць ужо сёння зрабіць унікальны праект «Машына часу» на сайце «Віцебская энцыклапедыя». Магчыма сумясціць розныя карты, уключаючы гістарычныя, у наваколлі Віцебска і пераключацца з адной на другую карты і іншыя выявы адным клікам мышкі...

Пакуль у нас ёсць час для ажыццяўлення гэтага, не пабаюся заявіць на ўсю краіну, сацыяльна значнага і ўнікальнага праекта. Наколькі ён рэальны на практыцы, мы атрымаем магчымасць убачыць у найбліжэйшай будучыні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**


Малюнак Віцебска Напалеона Орды з берага Заходняй Дзвіны.


Краязнавец і даследчык гісторыі Віцебшчыны і Заходняй Дзвіны Сапуноў.

■ Землякі

# Матрос з роду Глебкаў

## У памяць аб сыне, расстраляным за ўдзел у Кранштацкім паўстанні, бацька паставіў капліцу

**Пра лёс свайго земляка, трагічны і гераічны адначасова, я ўпершыню даведаўся з кнігі гісторыка Эдуарда Карніловіча «Імёны з небыцця». Адразу ж патэлефанаваў свайму колішняму аднакласніку Колю Туру, які застаўся працаваць аграномам у родных мясцінах, цяпер, натуральна, на пенсіі і надалей жыве ў сваім Задворы, а яно побач з вёскай Харосіца, дзе нарадзіўся, гадаваўся і адкуль рушыў у далёкі свет герой гэтай нататкі Цімафей Глебка. Расказаў пра яго, спытаў, ці ведае ён штосьці пра гэтага чалавека. Кажа, што смутна штосьці прыгадвае, але больш дакладна паабяцаў распытаць у людзей старэйшых. А яшчэ я ў яго спытаў пра каплічку, што стаіць ля дарогі паміж Задворам і Харосіцай. Коля адказаў, што яе даглядаюць людзі, але, у гонар каго яна збудавана, ён не ведаў. Я спытаў таму, што смутна ўзгадаў, што калісь мой бацька расказваў, што яна пабудавана ў гонар матроса, які нібыта загінуў на вайне. Зрэшты, дэталяў той размовы мая памяць не зберагла, але што гаворка датычыла ваеннага марака, гэта я добра запомніў...**

У той самы дзень Коля мне адзваніў, паведаміў, што размаўляў са старажылам, які пацвердзіў, што матрос той быў з роду Глебкаў, а калі бацька даведаўся пра ягоную смерць, то і вырашыў у яго памяць збудаваць капліцу, дзеля чаго прадаў морг зямлі. Цяпер яе даглядаюць сем'і двух братоў Глебкаў, адзін з якіх працуе жывёлаводам, а другі шафёрам. Але жывуць яны ў вёсцы Падкасоўе, і як звязацца з імі, Тур не ведаў. Тады я патэлефанаваў свайму знаёмаму заатэхніку на пенсіі Жоліку Віктару, які мне дапамог скантактавацца з Глебкамі. Больш за тое, што ўжо ведаў я, яны мне мала сказалі, як і іхні бацька, чалавек састарэлы. Пра Цішку і яны, і Міколаў знаёмы расказвалі як пра надзвычай дзейснага і шмат у чым здольнага, кемлівага хлопца, стройнага, прыгожага, прывабнага для дзяўчат. А як у яго склаўся лёс — ніхто не ведае. І фотаздымка на памяць ён не пакінуў, не засталося ў родзічаў ні Цішкавага, ні ягонага бацькі, які будаваў капліцу. Так што адзіная відочная памяць — гэтае досыць зграбнае збудаванне, якое высвечвае белізною, асабліва выразнай у вясновалетнія дні пасярод зялёнай пашы.

Служыў Глебка на Балтыцы ў марской крэпасці Свеаборг непадалёку ад Гольсінфорса. Дакументы Цэнтральнага архіва ваенна-марскога флоту Расіі сведчаць:

«Глебка Цімафей Лукіч нарадзіўся 22 студзеня 1881 года ў вёсцы Харосіца Нягневіцкай воласці Навагрудскага павета. 13 снежня 1902 года залічаны навабранцам у 20 флоцкі экіпаж. 31 красавіка 1903 — матрос 2 стацці крэйсера «Генерал-Адмірал». З 1904 года плаваў на параходзе «Ільмень». З 1 студзеня 1906 года пераведзены ў качагары I стацці. 1 красавіка 1906 года назначаны ў качагарныя кватэрмайстры».

З гэтага дакумента відаць, што ў Цімафея былі і павышэнні, і паніжэнні, але на чацвёртым годзе марской службы яму прысвойваецца унтэр-афіцэрскае званне.

Падзеяй, якая істотна паўплывала на матроса, з'явілася «крывавая нядзеля» ў Пецярбургу, падчас якой была расстраляна войскамі вера людзей у цара: яна ўскалыхнула не толькі сталіцу, але ў той ці іншай меры і ўсю Расійскую імперыю. У кранштацкія казармы часта пачалі наведвацца падпольшчыкі-рэвалюцыянеры, якія агітавалі за звяржэнне цара, перадачу зямлі таму, хто яе апрацоўвае, за дэмакратычныя свабоды. Усё гэта было блізкім і зразумелым нашаму земляку, і ён пад уплывам бальшавікоў уступіў у Кранштацкую вайсковую арганізацыю РСДРП.

19 ліпеня 1906 года ў адзінаццаць гадзін вечара прагучаў сігнал да паўстання ў Кранштаце. Пачаліся ўзброеныя сутыкненні, з'явіліся параненыя і забітыя. Цімафей Глебка, разам са сваімі землякамі-беларусамі, быў сярод самых рашучых і адчайных.

Але няўзгодненасць дзеянняў, недастатковая падрыхтоўка, дэзарганізацыя, ды падступная дзейнасць правакатараў, якія выдалі ўладам звесткі пра тэрмін паўстання, — усё гэта паспрыяла таму, што загадзя падрыхтаваныя царскія войскі ўжо на наступны дзень задушылі закалот. Пра яго масавасць сведчыць тое, што было арыштавана больш як дзвесце тысяч рэвалюцыянераў. Паводзіны Цімафея Глебкі пад арыштам сведчаць пра тое, што перад намі сапраўды мужны, духоўна нязломны чалавек, які верыць у справядлівасць змагарнага шляху, на які ён стаў. Вось адзін з яго лістоў, адрасаваных родным у Харосіцу:

*«Дарагія бацькі, тата, мама, браты і сёстры!*

*Даруйце мне мой учынак, калі вы яго палічыце злачынствам, але я яго злачынствам не лічу. Вы ведаеце, якім я быў да паступлення на службу. Як вам вядома, абвяргаў лад існуючага парадку ў Расіі. Паступіў на службу і хутка далучыўся да людзей, што змагаліся за свабоду. Служыў я, вам невядома як, але людзі, што мяне ведаюць, добра пра мяне адзавуцца...*

*Як вам вядома, ваенныя пачалі выступаць у падтрымку народа. Гэта было ўжо ў многіх гарадах — іх расстрэльвалі. І вось з 19 па 20 ліпеня выступіў наш Кранштат. Але тут здрадзілі свае таварышы, якія на апошнім сходзе далі брацкі пацалунак і паціснулі руку, але яны здрадзілі і засталіся вернымі сваім катам. Гэта — Енісейскі полк. Але, хаця многія з нас пацярпелі, мы выканалі тое, што на нас было ўскладзена. Мы выступілі без зброі, думалі завалодаць ёю, але атрымалася няўдача... Так, загінулі людзі і цяпер гінуць. Але я спадзяюся, што пасля нас нядоўга застанецца панаваць гэтым драпежным звярам — цару і яго памагатым.*

*Дарагія бацькі! Ёсць прымаўка: за царом служба, за Богам малітва не знікаюць. Але гэта наадварот: гіне маладое жыццё. Бывайце, бацька і маці. Сын ваш Цімафей, памёршы ў 25 гадоў, спакойна чакае сабе смерці. Даруйце, што раней не пісаў пісьмы: не пісаў таму, што вы ў чаканні маёй смерці турбаваліся б.*

*Я думаю, што, як вы даведаецеся падрабязнасці майго жыцця і які я быў, не будзеце мяне абвінавачваць. Бывайце!..*

*Сын ваш Цімафей Глебка».*

У лісце да сваіх братоў, Аўксенція і Івана, ён паведаміў: «Я прыгавораны да смерці за наступнае: за выпрацоўку плана паўстання, за распаўсюджванне сярод войскаў літаратуры і як арганізатар узброенага паўстання ў Кранштаце... Я спадзяюся, што вы не забудзецеся на брата, які ахвяраваў сабою за сваіх сяброў».

Два месяцы завадатары і ўдзельнікі паўстання былі ў турме. 17 верасня Ваенны суд пад старшынствам генерал-маёра Тамашэвіча, таксама, мабыць, беларуса, прыгаварыў 19 матросаў да смерці. Сярод іх былі трое беларусаў: Цімафей Глебка, Радзівон Каротчык і Емяльян Ляшук.

Праз чатыры дні адбылося пакаранне. Вось як занатаваў гэтую трагічную падзею відавочца: «...Цёмная, нерухомая маса людзей, застылая ў чаканні. Але асуджаныя былі спакойныя. На іх тварах, ледзь асветленых агнём, не было ні страху, ні сумненняў у праваце сваёй справы. Яны мужна чакалі таго, што павінна было адбыцца».

Па-летняму адзетых асуджаных падвялі да нацягнутага каната, паставілі ў адзін шэраг. За імі «на ўсякі выпадак» выставілі роту гвардзейскіх егераў і кулямёты. Толькі пачалі чытаць прысуд, як зняволеныя, сабраўшыся з сіламі, заспявалі: «Мы жертвою пали в борьбе роковой...»

— Рота, плі, — скамандаваў афіцэр.

Забітых паклалі ў мяхі, пагрузілі на параход і вывезлі ў адкрытае мора. І там, прывязаўшы цяжар, выкінулі за борт.

Жорсткая расправа над маракамі ўскалыхнула сумленных людзей Расіі, маракоў Балтыкі. Вядомы пісьменнік А. С. Новікаў-Прыбой адразу ж напісаў апавяданне «Бойня», а паэт Рыўкін песню «Море в ярости стонало».

Здавалася б, такую гераічную і мужную асобу, якой, бясспрэчна, быў Цімафей Глебка, павінны з асаблівай пашанай і гонарам шанаваць у яго на радзіме, найперш у школе, дзе ягоны ўчынак і смерць маглі б, асабліва ў савецкія часы, быць наглядным прыкладам да вывучэння гісторыі, падзей першай расійскай рэвалюцыі 1905—1906 гадоў. Але нам, вучням, пра гэтага мужнага чалавека ніхто і словам не сказаў ні на ўроках гісторыі, ні пры іншай нагодзе. Больш за тое, ледзь не разбурылі каплічку. Ініцыятарам выступіў не абы-хто, а камуніст, старшыня мясцовага калгаса. Нічога дакладна не кажучы, па якой патрэбе, загадаў трактарысту ехаць услед за ім у Харосіцу. Сам на легкавіку паехаў паперадзе і спыніўся ля каплічкі. Загадаў Івану зачапіць трос за наверша і адразу звярнуць крыж, а потым паспрабаваць разбурыць і капліцу. Ды нечакана наткнуўся на рашучы супраціў:

— Не-а, калі сам такі акаянны, то бярыся за рычагі і што хочаш рабі! А мне лепей хай рукі адсохнуць, каб я рабіў такое!..

На гэтым усё і скончылася. Аднаго людзі згадваюць добрым словам, а другі ў людской памяці абняслаўлены. А капліца стаіць і сёння.

**Яўген ЛЕЦКА**

■ Свет захапленняў

# ЛЯЛЬКІ АД ВІКТОРЫІ ЗЯЗЮЛІНАЙ

## Майстрыха са Шклова не шкадуе для свайго захаплення ні часу, ні ўласных строяў

**Уваходзіш у майстэрню Вікторыі, і вочы разбягаюцца ад той колькасці ляляк, якія размешчаны на сталах, палічках, у шафе. У дзяцінстве кожная з дзяўчынак толькі марыць аб такім шчасці. Вікторыя Зязюліна ўжо сама маці траіх дзяцей, але інтарэс да лялек у яе не знікае. Толькі цяпер яна разглядае іх не як цацкі, а як кавалачак нашай гісторыі і культуры. Аўтар прызнаецца, што ёй вельмі пашчасціла з бабуляй, якая не толькі навучыла вязаць і шыць, але яшчэ і прывіла любоў да роднага краю. Зараз яна перадае свае веды выхаванцам аматарскага аб'яднання «Эколаг», якое дзейнічае пры шклоўскім Доме культуры.**


Вікторыя ведае пра лялек усё.

### Абаронцы сямейнага дабрабыту

— Бабуля мне вельмі шмат казала пра абрады, танцы, нават паказвала, як танцаваць польку. Шкадую, што я ўсё гэта не запісала, — распавядае мая суразмоўца. — Але мяне больш цікавіла, а з чым гулялі дзеці раней, калі ў крамах не было ляляк. Яна казала, што іх рабілі з падручнага матэрыялу. У ход ішло тое, што заставалася пасля сельскагаспадарчай працы. Таму і лялькі былі розныя: ад драўляных да саламяных і льняных. Але адна справа — лялька для гульні, і іншая — для абярэгу.

Вікторыя толькі спачатку не разумела, як яны ўжываліся з хрысціянскімі традыцыямі. А калі праштудзіравала спецыяльную літаратуру, прыйшла да высновы: тое, што чалавек рабіў сабе абярэг, ніяк не ўплывала на яго стаўленне да Бога. Абярэг быў звычайным памочнікам, якога чалавек надзяляў сваёй сілай і верыў, што той яму дапаможа. Цікава, што абярэгі рабіліся ў асноўным для жанчын. Мабыць, жаноцкая доля ва ўсе часы была нялёгкай, і жанчыны шукалі памочніка не толькі ў малітвах, але і ў ляльках. Бог — гэта для ўсіх, а лялька — для яе асабіста.

Захапленне Вікторыі Зязюлінай мела вялікі поспех. Калі ў раён прыязджаюць замежныя дэлегацыі, іх цікавіць тое, што ўласціва для тутэйшай мясцовасці. І самаробныя лялькі ідуць на «ўра». Прыйшлося нават надпісы рабіць на некалькіх мовах, у тым ліку на англійскай.

— Вось гэта неразлучнікі, — паказвае Вікторыя сімвалічную парачку. — Яны непадзельныя: у іх агульная рука. Зрабіць такіх вельмі проста. Бярэцца палачка, і на ёй змяшчаюцца два кавалачкі тканіны. Хлопчыку робім штаны, дзяўчынцы — сукенку. Некалі гэты абярэг дарылі маладым падчас вяселля як сімвал кахання і вернасці, каб жонка з мужам былі адзіным цэлым.

У вясельным картэжы неразлучнікаў змяшчалі пад дугой каня. Менавіта з таго часу і пайшла традыцыя ўпрыгожваць машыны лялькамі, стужкамі, шарамі. Разам з маладымі лялька праязджала да царквы, а потым яе вешалі над ложкам мужа і жонкі — як абярэг на ўсё жыццё.

А далей калекцыя хатніх лялек толькі папаўнялася. Калі жанчына цяжарала, на свет спачатку з'яўлялася лялька-немаўлятка. Яе клалі ў люльку, каб яна была абярэгам ад сурокаў і злых духаў яшчэ да нараджэння дзіцяці і яго хрышчэння. Калі прыходзілі адведваць немаўля, звярталіся не да яго, а да лялькі: увесь негатыў, калі ён толькі быў, ішоў на неадушаўлёны прадмет. Пасля хрышчэння ляльку не выкідалі. Яна заставалася з дзіцем і была яго першай цацкай. Яе можна было пацiскаць і нават паспрабаваць на зуб без рызыкі для здароўя: цалкам жа натуральны прадукт!

### Памочніца, лекарка, берагіня

Але большасць абрадавых лялек дзецям у рукі не давалі: яны былі чымсьці накшталт татэмаў. Людзям здавалася, што яны прыцягваюць шчасце, адганяюць хваробы, дапамагаюць берагчы мір у сям'і. Жанчыне даводзілася шмат чаго рабіць па доме, і ў гэтым ёй дапамагала дзесяціручка. «Памочніца» жыла на кухні, дзе часцей за ўсё завіхалася жанчына: лічылася, што яе прысутнасць дазваляе гаспадыні ўсюды паспяваць і не стамляцца. Яшчэ адным абярэгам для жанчыны была парачка лялек «дзень-ноч». Дзённая (светлая) спрыяла ўдачы, а начная (цёмная) — ахоўвала спакой.

У даўніну жыць у згодзе дапамагала і ачышчальная лялька. Рабілася яна без іголак і нажніц, кавалачкі тканіны проста папярэдне рвалі рукамі. Яе дарылі імяніннікам ці маладым, каб іх жыццё было не калючым і не рэзаным. Ачышчальная лялька стаяла навідавоку. Калі здараліся сваркі, адчынялі вокны і дзверы, каб лялька «вымятала» за парог слоўнае смецце.

У кожнай сялянскай хаце «жыла» збожжавая дзяўчынка, асновай для якой служыў мяшочак з зернем, сабраным з першых каласоў. Ставілі яе пад абразамі, а вясной менавіта з яе пачыналі сеў — каб ураджай быў не горшы, чым леташні.

Аб хвароб ратавала лялька-траўніца, у якую клалі 7 лекавых раслін. Калі ў доме былі маленькія дзеці, яе змяшчалі над калыскай. А без «вандроўніцы» (у мяшочак-аснову клалася «часцінка зямлі роднай») не адпраўляліся ў далёкую дарогу. Лялька нагадвала чалавеку аб доме, дзе яго чакаюць.

### Каб жаданні здзяйсняліся

— Ведаеце, што чалавеку патрэбна для шчасця? — пытаецца Вікторыя, трымаючы ў руках ляльку. — Каб целу было добра, душы радасна, а духу спакойна. Аб чым нагадваюць тры спадніцы, у якія апранута вось гэтая «шчаслівая» лялька. Яна наогул дзяўчына вясёлая, прыносіць у дом радасць. Трэба трымаць яе на бачным месцы.

У тых дзяўчат, якія збіраліся замуж, таксама была «свая» лялька. Яна рабілася пышнагрудай з вялікай колькасцю спадніц. Лялька размяшчалася на акенцы ці на самым бачным месцы ў хаце — і хлопцы маглі смела засылаць сватоў.

Лялька пажаданняў і наогул спрыяла выкананню патаемнай мары. Але пакуль яна не здзейсніцца, ніхто нават пра існаванне лялькі не павінен быў ведаць. Таму і рабілі яе ўпотай. Са словамі «Лялечка, выканай, даражэнькая, маё жаданне» дзяўчына прышывала ёй на сукенку падарунак — які-небудзь гузік. Калі жаданне здзяйснялася, гаспадыня даставала яе з патаемнага месца, дзякавала, а калі з'яўлялася яшчэ жаданне, зноў рабіла ёй падарунак і хавала. Дарэчы, дзве апошнія лялькі — самыя запатрабаваныя ў пакупнікоў.

### ...І прыемныя дробязі

Зрабіць абрадавую ляльку можа кожны — было б жаданне. Галоўная ўмова — у яе не павінна быць твару. Лічылася: той, хто мае вочы, — мае і душу. А значыць, паддаецца ўздзеянню збоку і сам можа на кагосьці паўплываць. З дэкаратыўнай лялькай — іншая справа. У Вікторыі яны зроблены па асаблівай тэхналогіі з драўлянай асновы. Першай у яе калекцыі была зімовая лялька. Майстрыха зрабіла ёй ільняныя валасы і гіпюраваю сукенку... са сваёй вясельнай спадніцы. Як толькі не шкада было?

— Імператрыцы я таксама зрабіла адзенне са свайго вясельнага строю, — Вікторыя дэманструе «даму» ў шыкоўным касцюме. — Мне наогул нічога для лялек не шкада. А вось на гэтай прыгажуні з плацінавымі валасамі — адзенне з матулінай вясельнай сукенкі.

Пацеркі, брошкі — усё ідзе ў ход. У скрыначках майстрыхі чаго толькі няма — і бісер, і стужкі, і гузікі.

— Гэта вось — нявеста, — паказвае Вікторыя прыгажуню ў... стракатай спадніцы і адказвае на маё здзіўленне: — Белыя сукенкі былі ў прадстаўніц багатых саслоўяў, а ў вёсках прыбіраліся ў простае адзенне. Прычым нявеста гэта славянская. Беларускі такія яркія сарафаны не насілі.

У першых лялек быў плоскі намаляваны твар, але нядаўна Вікторыя навучылася рабіць рэльефны — з гліны. Справа гэта для яе новая, але поспехі ўжо ёсць. Тое, што твары не заўжды казачна прыгожыя, не бянтэжыць аўтара. Людзі ж таксама розныя бываюць, у тым і прывабнасць. Напрыклад, летняя лялька ў Вікторыі атрымалася падобная... на актрысу Валянціну Талызіну.

Калі яна толькі зрабіла «вясну» і «зіму», у яе спыталі, чаму лялькі не маюць жаноцкіх формаў. Аўтар хуценька выправіла становішча. Наступныя ўжо адрозніваліся не толькі тварам, але і фігурай.

Яшчэ адна асаблівасць гэтых лялек у тым, што яны маюць шмат дробных дэталяў. Кветкі, ягады, вянкі з вінаграду... Ну а дамы у стылі XIX стагоддзя, акрамя складаных строяў, маюць нават сумачкі. Зараз майстрыха працуе над лялькамі ў магілёўскіх строях. Зноў прыйшлося вывучаць літаратуру — хто ў што павінен быць апрануты. Запаветная мара Вікторыі — зрабіць хаця б па дзве лялькі ў строях ад кожнай вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**


У вясельных суконках.


Ну чым не Валянціна Талызіна?


Лялькі «ад хвароб» і «для ачышчэння» калісці былі ў кожным доме.

# У ЛЕВАЙ КІШЭНІ — СПАЙС, У ПРАВАЙ — ГРОШЫ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы адсочвалі аперацыю — ад пачатку да фінішу — тры гадзіны. Спачатку проста сядзелі ў адной з машын і праслухоўвалі па радыёсувязі, як адсочваецца кожны рух наркагандляра, якому «селі на хвост». Цяжка прадбачыць, як пачнуць разгортвацца падзеі, а таму кожная фраза, што перадаецца па рацыі, — фактычна прыняцце чарговага рашэння.

«Картэж» з аператыўнікамі пераязджае з месца на месца, і вось мы ля аднаго са шматпад'ездных дамоў на Бялінскага. Некалькі чалавек, якія вонкава нічым не адрозніваюцца ад тых, што ходзяць у сярэдзіне дня па сталічных вуліцах, імгненна скручваюць рукі маладому чалавеку ў капелюшы, карычневай куртцы, яркіх красоўках і спартыўных штанах. Чорныя наручнікі замыкаюцца за яго спінай. Хлопца вядуць у мікрааўтобус з нашага «картэжу». Нас з фотакарам просяць пакуль застацца ў «нашай» машыне, паколькі аперацыя яшчэ не завершана.



У інтэрнаце, ад якога толькі што адышоў затрыманы, знаходзіцца яшчэ адзін гандляр — ён і прадаў «карычневай куртцы» наркотык. Трое людзей у масках «бяруць» гэтага другога ў калідоры, ля пакоя пад нумарам 36.

**На падлогу з кішэняў выкладваюцца курыльная сумесь у паперы — рэчыва расліннага паходжання карычневага колеру (дэманструецца панятым), пяць купюр наміналам па 200 тысяч рублёў.**

Тым часам да мікрааўтобуса для складання належных дакументаў запрашаюць панятых — двух прахожых мужчын. У іх прысутнасці адбываецца вобыск першага затрыманага. З усіх кішэняў опер дастае ўсё, што там ёсць: маркер, ключы, жуйкі, мабільнік, наркотык — поліэтыленавы пакецік з зеленавата-карычневай травой. Эксперт пасля прызнае «траву» асабліва небяспечным рэчывам. Гэта — курыльная сумесь, апрацаваная «сінтэтыкай». Спайс.

Мабільнік затрыманага пачынае разрывацца. На экране высвечваецца слова «мама»...

Я пытаюся ў хлопца дазволу задаць яму некалькі пытанняў. Ён пагаджаецца.

— Як цябе завуць і колькі табе гадоў?

— Саша... сямнаццаць.

— Твая сям'я?..

— Мама працуе ў тэатры, у аддзеле кадраў. У таты свой бізнес — пераганяе машыны, прадае. Ёсць сястрычка, 2002 года нараджэння. Тата жыве асобна. Бацькі развяліся...

— Дзе вучышся?

— Ва ўніверсітэце фізкультуры, займаюся грэбляй...

— Дзе ты ўзяў спайс?

— У Сашы...

— Ты даўно прадаеш наркотыкі?

— Я нічога не прадаю... Мне хлопец напісаў «Вконтакте»... Я сказаў, што не займаюся гэтым. Зразумеў, што яны хочуць выйсці на прадаўца. Я адразу зразумеў, як сустрэўся... Сам сябе падставіў...

— Ты сам ужываў спайс?

— Ужываў... Спайс і насвай... Ну, насвай — гэта ж не наркотык...

— Табе спадабаўся эфект ад спайсу?

— Ды мне страшна стала... Я пакурыў проста таму, што мне было дрэнна. У мяне там з дзяўчынкай закруцілася... Тады мяне «ўзялі» першы раз...

— Міліцыя ўзяла цябе, калі ты быў «пад спайсам»?

— Ну, так... Я ішоў ва ўніверсітэт. Мне было вельмі дрэнна... Страшна... Такое незразумелае пачуццё... Не магу патлумачыць. Нібыта я не тут... Ну, страшна...

— Ты аднойчы курыў?

— Разы тры-чатыры...

— Калі было страшна першы раз, навошта ты курыў зноў?

— Не ведаю... Ды мне было ўсё роўна, што са мной будзе... Я наогул хацеў пайсці з жыцця... Дзяўчынку адну кахаў, а яна мне хлусіла, казала, што толькі мяне кахае, а сама яшчэ з другім хлопцам сустракалася... Неяк сказала, што была цяжарнай... Я пачаў распытваць, што азначае «была». А яна дала зразумець, што аборт зрабіла... Мне пасля гэтага стала так невыносна... І пацягнула на прыгоды.

— Вы і цяпер разам?

— У мяне ўжо другая... Цяпер ужо і яе, напэўна, няма...

— Ты перажываеш з-за таго, што бацькі ў разводзе?

— Вельмі моцна.

— Бацька падтрымлівае стасункі з табой?

— Так, але мне ўсё роўна яго не хапае...

Па перапэцканым зямлёй твары Сашы пабеглі слёзы... Мне хацелася яшчэ нешта сказаць, але тут з адной Сашавай рукі знялі наручнік і далі распісацца ў дакуменце «Тлумачэнне». Адзін з аператыўнікаў заўважыў: «У такой сітуацыі яны могуць плакаць, а могуць і ў твар плюнуць, лаяцца, абражаць... Бывае рознае. А тое, што ён ведаў, нібыта за ім «сочаць» — лухта. Яны што заўгодна могуць плесці, абы толькі іх адпусцілі...».

У інтэрнаце дэпартамента «Белаўтадар» загадчыца спачатку спрабуе распытаць аператыўнікаў, за што і чаму, а пасля пачынае скардзіцца на тое, як «яны ўжо абрыдлі — і ён, і яго наркаманка»... Можна толькі здагадвацца, што размова ідзе пра другога Аляксандра, пра якога сказаў першы затрыманы Саша, і па ўсім відаць, пра нейкую дзяўчыну, да якой той прыходзіў у гэты інтэрнат. У пакоі, дзе другі затрыманы Саша сядзіць у наручніках, — невялікі ложак, крэсла, тэлевізар і шмат цацак...

**Начальнік аддзела па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі Партызанскага РАУС г. Мінска падпалкоўнік міліцыі Дзяніс БУРЫ** звяртаецца да чарговых панятых і затрыманага: «Грамадзянін Аляксандр Ш. затрыманы па падазрэнні ў незаконным абарачэнні наркотыкаў. У прысутнасці панятых прапануем добраахвотна здаць забароненыя прадметы — зброю, наркотыкі, якія ёсць пры сабе».

— У кішэні, — ціха, апусціўшы вельмі нізка галаву, кажа другі Саша.

— Што ў кішэні?

— Міксы...



Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

— Гэта што такое?

— Курыльная сумесь... у паперы.

— Грошы пры сабе ёсць?

— Ёсць, у правай кішэні.

— Колькі? Адкуль?

— Адзін мільён беларускіх рублёў. За збыт курыльнай сумесі.

— Зараз будзе праведзены асабісты вобыск, — кажа падпалкоўнік Буры. — Звяртаю ўвагу: у мяне ў руках нічога няма.

На падлогу з кішэняў выкладваюцца курыльная сумесь у паперы — рэчыва расліннага паходжання карычневага колеру (дэманструецца панятым), пяць купюр наміналам па 200 тысяч рублёў. Саша адказвае на пытанні аператыўнікаў, якія прыступаюць да афармлення папер пад назвай «Тлумачэнне».

— Нарадзіўся ў 1996-м. Жыву па адрасе... Раней не судзімы...

У гэтага Сашы ёсць поўная сям'я. Сюды ён прыходзіць «у госці». Размаўляць са мной адмовіўся. Увесь час трымае галаву нізка нахіленай. Пасля падпісання затрыманым і панятымі складзеных дакументаў Сашу выводзяць з інтэрната. Аператыўнікі выканалі сваю частку працы, і Дзяніс Буры падводзіць вынік:

**Злачынцы выдатна ўсведамляюць, што захоўваюць і прадаюць не папкорн, а забароненыя законам рэчывы, а таму і хаваюцца, і перастрахоўваюцца.**

— У аддзел па наркакантролі Партызанскага раёна паступіла аператыўная інфармацыя аб тым, што Аляксандр М. займаецца захаваннем і распаўсюджваннем псіхатропнага рэчыва — курыльнай сумесі, або «спайсу», або «міксу». Падчас праведзеных аператыўных мерапрыемстваў апошні быў затрыманы па вуліцы Бялінскага. Аляксандр М. патлумачыў, што гэтае рэчыва набыў у Аляксандра Ш., які ў момант здзелкі знаходзіўся ў памяшканні інтэрната. Аляксандр Ш. таксама затрыманы. У першага канфіскаваны поліэтыленавы пакецік з асабліва небяспечным псіхатропным рэчывам, у другога — папяровы пакецік з такім жа рэчывам і грашовая сума, якая была атрымана за дозу, перададзеную ў выніку здзелкі Аляксандру М. 1 мільён рублёў — столькі каштуе каля 5 грамаў спайсу. Маладыя людзі падтрымлівалі сувязь па тэлефоне, яны знаёмыя і дзейнічалі падобным чынам не першы раз. Абодва і ўжывалі, і збывалі. Дзе яны бралі наркатычныя рэчывы, яшчэ належыць высветліць. Аляксандру М. пагражае да 5 гадоў пазбаўлення волі, другому — ад 8 да 13-і...

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ГУКАЦЬ ДЫК ГУКАЦЬ!..

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Не першы год народныя святы на музейнай пляцоўцы наведваюць замежныя госці з азіяцкіх краін. Для дзяцей і дарослых ладзілася шмат самых розных забаў, не лічачы традыцыйнага караскання па слупе за прэзентамі і гульню з чыгунком на галаве. Было дзе сябе праявіць нават самым лянівым.

Яшчэ загадзя быў абвешчаны конкурс на самую лепшую ляльку-марэну. Але на яго адгукнулася толькі адна сталічная жыхарка — Алена Кавалёва. Яна і стала пераможцай. Ад Алены пачуў:

«Разам з малодшай сястрой Дар'яй шылі гэтую ляльку два дні, як і належыць, без іголкі, завязалі на ёй стужкі жаданняў і хочам спаліць, каб негатыўнае і шкоднае засталося толькі ў мінулым.

Масленіца — першая ластаўка вясны. І першыя вясновыя гуканні пачынаюцца мінавіта ў гэты дзень.

**Анатоль КЛЯШЧУК Фота аўтара.**







# ЦІ ВЫСТАІЦЬ ВЕНЕСУЭЛА ЧАВЕСА?

**Акцыі пратэсту ў Каракасе і сталіцах венесуэльскіх штатаў, заявы апазіцыі аб правакацыях з боку ўрада, звесткі пра раненых і забітых — зараз стужкі навін рэгулярна звяртаюцца да палітычнай сітуацыі ў Венесуэле, маўляў, яна блізкая да дзяржаўнага перавароту. Наколькі гэта праўда, на сустрэчы з журналістамі расказаў спадар Амерыка Дыяс НУНЬЕС, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Венесуэлы ў Беларусі.**

## Дэмакратыя па-венесуэльску

Пасол звярнуў асаблівую ўвагу на той факт, што Венесуэла — дэмакратычная дзяржава, якая мае на мэце пабудову сацыяльна справядлівага грамадства.

У 1999 годзе ў краіне прайшоў першы ў яе гісторыі нацыянальны рэферэндум, у выніку была прынята новая канстытуцыя, якая дзейнічае і цяпер. Паводле асноўнага закону, у краіне ўважліва сочаць за выкананнем правоў карэннага насельніцтва, а таксама сацыяльных правоў. Так, згодна з канстытуцыяй, індзейскія мовы з'яўляюцца афіцыйнымі мовамі дзяржавы, акрамя таго, за прадстаўнікамі індзейскіх плямёнаў замацавана права на тэрыторыі спрадвечнага пражывання. Таксама ў Венесуэле ўведзена пасада амбудсмена — чалавека, на якога ўскладзены функцыі кантролю за тым, каб органы выканаўчай улады і службовыя асобы прытрымліваліся прынцыпаў справядлівасці і не парушалі сваёй дзейнасцю інтарэсаў асобных сацыяльных груп.

**Венесуэла, такая ж багатая, як і дзяржавы Аравійскага паўвострава, вымушана пакутаваць ад недахопу самага неабходнага.**

У канстытуцыі замацавана, што змена ўрада ў Венесуэле адбываецца праз дэмакратычныя выбары. Дарэчы, з 1999 года ў краіне адбылося 17 выбарчых кампаній нацыянальнага і рэгіянальнага ўзроўняў, і толькі на адной з іх перамаглі цяперашнія апазіцыянеры. Аднак, па словах дыпламата, дэмакратыя ў краіне заключаецца не толькі ў свабодных выбарах. Так, цэнзура забаронена нацыянальнай канстытуцыяй. Свабоду слова рэгулюе толькі адно палажэнне — усе грамадзяне нясуць адказнасць за свае выказванні. Таксама пасол звярнуўся да таго факта, што ў краіне няма палітычных зняволеных, праўда, ёсць палітыкі, асуджаныя за правапарушэнні, якія кваліфікуюцца ў заканадаўстве як забойствы, даказаныя ў судзе выпадкі карупцыі і іншыя злачынствы.

## Чаму ў краіне неспакойна?

«Венесуэла — смачны кавалак для некаторых краін, у прыватнасці, для Злучаных Штатаў, — заявіў спадар Амерыка Дыяс Нуньес. — З 1999 года яна з'яўляецца мішэнню змоў, мэта якіх — адхіліць ад улады Уга Чавеса, а цяпер і яго паслядоўніка — Нікаласа Мадуру». Так, у 2002 годзе ў Венесуэле адбылася спроба дзяржаўнага перавароту: уладу захапілі паўстанцы, а Уга Чавеса адправілі на ваенную базу на востраве Арчыла. «Аднак народ выйшаў на вуліцы і аднавіў законную ўладу за 47 гадзін», — нагадаў пасол.

Пасол паведаміў, што, распрацаваны Злучанымі Штатамі сцэнарый прадугледжвае правакацыю масавых пратэстаў сярод насельніцтва Венесуэлы. «Эканамічная вайна», накіраваная на стварэнне перабояў з пастаўкамі тавараў першай неабходнасці і як вынік — падаражанне жыцця людзей, з'яўляецца адным з падраздзелаў гэтага плана па змене ўлады ў Венесуэле, лічыць афіцыйны прадстаўнік гэтай краіны ў Беларусі.

Трэба адзначыць, што эканоміка Балівaрыянскай рэспублікі — адной з самых багатых на карысныя выкапні краін — цалкам пабудавана на экспарце нафтапрадуктаў. Больш за тое, каля 90% насельніцтва жыве ў горадзе, а значыць, вельмі мала застаецца людзей, якія маглі б забяспечыць краіну прадуктамі харчавання. Гэта прывяло да таго, што Венесуэла вымушана імпартаваць прыкладна дзве трэці прадуктаў. А адзін з асноўных пастаўшчыкоў харчавання ў краіну — Злучаныя Штаты. Вось і атрымалася, што Венесуэла, такая ж багатая, як і дзяржавы Аравійскага паўвострава, вымушана пакутаваць ад недахопу самага неабходнага.



Студэнцкія пратэсты ў горадзе Маракайба, сталіцы штата Сулія.

Спадар Амерыка Дыяс Нуньес зрабіў акцэнт на тым, што Злучаныя Штаты рэгулярна выдаткоўваюць велізарныя сродкі на правядзенне гвалтоўных акцый у Венесуэле. Так, у 2009 годзе яны выдзелілі на гэта 15 мільёнаў долараў. «А перад прэзідэнцкай кампаніяй 2012 года замежнае фінансаванне тых сіл, якія выступаюць супраць баліварыянскага ўрада, дасягнула 57 мільёнаў долараў, — праінфармаваў дыпламат. — Паводле звестак, абнародаваных WikiLeaks, такая сума была выдаткавана з дакладнай мэтай — забяспечыць паражэнне Уга Чавеса на выбарах. Аднак такога не здарылася».

## Медыяпадман

Асаблівую ўвагу пасол звярнуў на непраўдзівасць і недарэчнасць многіх публікацый сусветных сродкаў масавай інфармацыі пра падзеі ў Венесуэле. Каб не быць галаслоўным, ён прывёў канкрэтныя прыклады. Так, яшчэ ў чэрвені 2012 года адна з вядучых газет Іспаніі надрукавала артыкул пад назвай «Гвалт пад прыкрыццём дзяржавы». Натуральна, матэрыял меў ілюстрацыю. Праўда, з акцый пратэсту ў Егіпце, якія мелі месца ў 2011 годзе. Тым не менш, гэта не перашкодзіла супрацоўнікам рэдакцыі зрабіць подпіс, што, маўляў, так здзекуюцца з людзей у Венесуэле. Таксама некаторыя газеты бралі фотаздымкі з акцый пратэсту ў Чылі, з бальніц Гандураса для ілюстрацыі артыкулаў пра сённяшнія падзеі ў Баліварыянскай рэспубліцы. І подпісы да фотаздымкаў былі адпаведнымі.

Быў і смешны ў некаторым сэнсе прыклад. Так, шматлюдны хрэсны ход у гонар святой Дзевы Марыі (венесуэльцы — вельмі рэлігійная нацыя) выдалі... за акцыі пратэсту ў Каракасе. А фотаздымкам з пекінскай плошчы Цяньаньмэнь у 1989 годзе праілюстравалі матэрыял аб сённяшніх пратэстах у Венесуэле.

Саветнікі Пасольства Венесуэлы адзначылі, што яны адразу бачаць недарэчнасць такіх публікацый, бо ведаюць сапраўдную сітуацыю ў сябе на радзіме. Але людзям з іншых краін амаль немагчыма праверыць, што адбываецца ў Венесуэле насамрэч і хто вінаваты ў гэтых падзеях, таму часта лжывыя публікацыі ў СМІ не знаходзяць процівагі.

## Беларусам небяспека не пагражае

У Венесуэле працуе прыкладна 1000 беларусаў. Ці пагражае ім небяспека? Спадар пасол запэўніў, што беларусы працуюць або за горадам, дзе няма акцый пратэсту, або на добра абароненых арміяй тэрыторыях. Больш за тое, спадар Амерыка Дыяс Нуньес нядаўна вярнуўся з Венесуэлы і падкрэсліў, што выступленні не маюць падтрымкі сярод большай часткі насельніцтва, беспарадкі адбываюцца ў кварталах, дзе жыве эліта і сярэдні клас. Дыпламат абсалютна ўпэўнены: Венесуэла зможа выстаяць, і ў хуткім часе сітуацыя нармалізуецца.

**Падчас беспарадкаў у Венесуэле загінула ўжо больш чым 50 чалавек. Пра гэта паведаміў прэзідэнт краіны Нікалас Мадура. Па яго словах, асноўная прычына гібелі людзей — гвалт і барыкады, якімі пратэстанты перакрылі дарогі. Таму многія пацярпелыя не змаглі дачакацца прыезду «хуткай дапамогі» — урачы проста не паспелі дабрацца да тых, каму патрэбна была дапамога.**

Не так даўно сродкі масавай інфармацыі паведамлялі пра тое, што з Венесуэлы высланы некаторыя амерыканскія дыпламаты. Чаму так здарылася? «Пасольства ЗША рэгулярна парушала некаторыя палажэнні Венскай канвенцыі аб дыпламатычных стасунках, — канстатаваў венесуэльскі дыпламат. — Як вынік, тры супрацоўнікі консульскай службы былі высланы з краіны. Прыкрываючыся падставай вырашэння візавых пытанняў для студэнтаў, яны фінансавалі і прымалі непасрэдны ўдзел у арганізацыі «мяккага» дзяржаўнага перавароту».

Адказваючы на пытанні журналістаў, пасол закрануў і эканамічныя аспекты беларуска-венесуэльскага супрацоўніцтва. Некалькі гадоў таму тавараабарот паміж нашымі краінамі перавысіў 1 мільярд долараў. З Венесуэлай рэалізуецца шмат сумесных праектаў у самых розных галінах — ад будаўніцтва, нафтаздабычы і ваеннага супрацоўніцтва да сельскай гаспадаркі, навукі і адукацыі. Аднак за мінулы 2013 год, па папярэдніх звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі, мы нагандлявалі толькі на 53 мільёны долараў. Спадар пасол назваў такую сітуацыю не зусім звычайнай: «У нейкай ступені на яе паўплывала змена ўрада, аднак, няхай у лічбах гэта пакуль не праявілася, ідзе сумесная праца па ўсіх выбраных кірунках».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## Беларускія «сляды» Чавеса

**У Нацыянальнай бібліятэцы ў Мінску адкрылася фотавыстава пад назвай «5 гадоў — 5 візітаў». Мерапрыемства зладжана ў рамках міжнароднай кампаніі «Па слядах Чавеса», прымеркаванай да першай гадавіны са дня смерці прэзідэнта Венесуэлы.**

Наведнікі выставы змогуць пабачыць здымкі, зробленыя падчас афіцыйных візітаў Уга Чавеса ў Беларусь. На фота зафіксаваны моманты, калі прэзідэнт Венесуэлы знаёміўся з працай беларускіх прадпрыемстваў, наведваў установы навукі і культуры.

На адкрыцці выставы будуць уручаны прызы і падарункі пераможцам конкурсу дзіцячага малюнка на тэму «Чавес у Беларусі». У ім бралі ўдзел вучні 4-7 класаў беларускіх школ з паглыбленым вывучэннем іспанскай мовы.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## Поспех юных музыкантаў

**Паспяхова выступілі юныя віцебскія музыканты на міжнародным конкурсе маладых піяністаў «Амадэус-2014», які адбыўся ў чэшскім Брно. Усе яны — выхаванцы Віцебскай дзіцячай школы мастацтваў імя Анатоля Багатырова.**

Сямігадовая Ніколь Рагатнікава заваявала першае месца і спецыяльны прыз журы «За лепшае выступленне конкурсу». Яна адзіная прадстаўніца нашай краіны, якая стала ўдзельніцай канцэрта лаўрэатаў. Пяцікласнік Віктар Стэфаненка стаў дыпламантам конкурсу і ўладальнікам спецыяльнага прыза.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ на II кв. або 1–е паўг. 2014 года

Хатні адрас і тэлефон [ ] (індэкс) ____________________

Удачы ў розыгрышы!

**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**
**на II квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ДА 9 КРАСАВІКА ў рэдакцыю на адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**

СУПЕРПРЫЗ тэлевізар SAMSUNG

7 электрапрасаў BOSH

Сярод падпісчыкаў 11.04.2014 г. будуць разыграны 7 электрапрасаў Bosh і суперпрыз – тэлевізар Samsung. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» да 21.04.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.06.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.**
**Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 19.02.14 г.**
**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 20.02.14 ПА 30.06.14.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2302 ад 13.02.14, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Борисовская швейная фабрика» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

**легкового автомобиля Форд Фокус,**

**гос. № 1258 ЕА-5, 2006 г.в. Автомобиль находится по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9.**

**Начальная цена с НДС – 75 600 000 бел. руб.**

**Задаток в размере 10% (7 560 000 бел. руб.) от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.01.2014.*

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **20.03.2014 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 19.03.2014 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

> На 1 студзеня гэтага года пад абаронай падраздзяленняў аховы Гомельскай вобласці знаходзіцца больш як 36 тысяч аб'ектаў розных формаў уласнасці і звыш 30 тысяч памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян. Больш як чатыры тысячы аб'ектаў кантралююцца з дапамогай ручных сістэм трывожнай сігналізацыі.

# АХОВА

## ПАД ЗНАКАМ САВЫ



№ 2 (41)

СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

> Мы ахоўваем дыпламатычныя місіі, па асобным дагаворы — рэзідэнцыі пражывання паслоў, а таксама асабліва важныя дзяржаўныя аб'екты (Міністэрства замежны спраў, Вярхоўны Суд), усе аб'екты «Белтэлерадыёкампаніі». Акрамя таго, мы ўдзельнічаем у пратакольных мерапрыемствах.

## ЯК УТРЫМАЦЬ РЭЙТЫНГ ДАВЕРУ

**Надзейнасць, заснаваная на шматгадовых традыцыях, і якасны кадравы патэнцыял Гомельшчыны, дазваляюць абласному Дэпартаменту аховы на працягу некалькіх гадоў трывала ўтрымліваць высокі рэйтынг даверу насельніцтва і ўваходзіць у лік аднаго з лепшых упраўленняў аховы рэспублікі.**



Фота Алены ЯРМАЛІНСКАЙ.

Сёння Гомельшчына давярае нам не толькі ахову кватэр, але і банкаў, музеяў, гісторыка-архітэктурных і культурных комплексаў, крам, адукацыйных устаноў, аб'ектаў аховы здароўя...

Пра паспяховае заканчэнне мінулага года і стабільнае развіццё службы нам распавёў **начальнік Гомельскага абласнога ўпраўлення палкоўнік міліцыі Аляксандр ЛІСІМАЎ.**

***— Аляксандр Фёдаравіч, пастаянства — гарантыя поспеху! Як вам удаецца столькі гадоў запар трымаць марку?***

— Перш за ўсё, важны ўзровень падрыхтоўкі супрацоўнікаў, які з кожным годам значна павышаецца. Сутыкаючыся ў штодзённай службе са злачынцамі, нашы міліцыянеры часцей за ўсё першымі аказваюцца на месцы здарэння, што дазваляе ў кароткі час прыняць адзінае правільнае рашэнне па абясшкоджванні правапарушальніка. Грамадзяне могуць адчуваць сябе спакойна і абаронена — нашы хлопцы дзейнічаюць рашуча і прафесійна.

Гаворачы пра ўдасканальванне, варта адзначыць, што супрацоўнікі аховы, удзельнічаючы ў рэспубліканскіх конкурсах прафесійнага майстэрства, паказваюць годны вынік, стабільна займаючы прызавыя месцы.

Немалаважным кампанентам нашага поспеху з'яўляецца тэхнічнае забеспячэнне падраздзяленняў. Мы імкнёмся выкарыстоўваць самыя сучасныя ахоўныя прыборы, якія дазваляюць своечасова рэагаваць і прадухіляць любую спробу крадзяжу.

***— Колькі аб'ектаў ахоўваецца вашым упраўленнем?***

— Па стане на 1 студзеня гэтага года пад абаронай падраздзяленняў аховы Гомельскай вобласці знаходзіцца больш як 36 тысяч аб'ектаў розных формаў уласнасці і звыш 30 тысяч памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян. Акрамя гэтага, больш як чатыры тысячы аб'ектаў кантралююцца з дапамогай ручных сістэм трывожнай сігналізацыі.

***— Акрамя ахоўных функцый, наколькі вашы супрацоўнікі задзейнічаны ў сістэме адзінай дыслакацыі АУС?***

— Нашы экіпажы, як правіла, адны з самых мабільных. Улічваючы статыстыку мінулага года, падчас нясення службы на пастах і маршрутах патрулявання, пры адпрацоўцы арыенціровак з тэрытарыяльных РАУС, аператыўным рэагаванні на спрацоўванне сродкаў сігналізацыі на ахоўных аб'ектах і памяшканнях з асабістай маёмасцю грамадзян нарадамі аховы раскрыта 731 злачынства, з якіх 681 — па лініі крымінальнага вышуку; 378, або больш як 50%, злачынстваў раскрыта па «гарачых слядах» (з іх 145 — з дапамогай службовых сабак). У ліку раскрытых злачынстваў два забойствы, адзін факт прычынення смерці па неасцярожнасці, 15 фактаў пагрозы забойствам, 12 — нанясення цяжкіх, 3 — менш цяжкіх і 5 — лёгкіх цялесных пашкоджанняў, 8 катаванняў, адно згвалтаванне, 7 разбояў, 56 абрабаванняў, 232 крадзяжы, 74 хуліганствы, 13 згонаў аўтатранспарту, 6 фактаў супраціўлення і 6 фактаў гвалту альбо пагрозы гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі, а таксама 49 злачынстваў, звязаных з незаконным абарачэннем наркатычных і псіхатропных рэчываў.

***— Ці атрымліваецца знайсці аднадумцаў у такой няпростай справе?***

— Калектыў — трывалы падмурак нашага ўпраўлення. Ужо на працягу 5-10 гадоў нам удаецца захаваць кадравае ядро кіраўнікоў, намеснікаў і работнікаў, якія пачыналі міліцэйскі шлях у ахове. Таму менавіта гэтыя людзі, якія ведаюць службу знутры, не па чутках, штодня імкнуцца да дасканаласці, прапаноўваючы і ўкараняючы новыя формы і метады працы. У калектыве ўсё ўзаемазвязана: вопытныя кіраўнікі і ініцыятыўныя выканаўцы — менавіта гэтыя людзі фарміруюць асабовы склад нашага рэгіёна. Я прывык давяраць людзям дасведчаным, якія ўвесь час знаходзяцца ў пошуку новага, таму ў нас адны мэты!

***— Як часта вы чуеце словы падзякі на адрас Гомельскага абласнога ўпраўлення?***

— Мой адказ здасца банальным, але, выконваючы сваю працу, мы не чакаем падзяк. Сёння ў нашых падраздзяленнях працуюць па-сапраўднаму адданыя сваёй справе і закону людзі. На рахунку многіх супрацоўнікаў за гады нялёгкай службы дзясяткі раскрытых злачынстваў, сотні затрыманых злачынцаў, далёка не адно выратаванае чалавечае жыццё. І за гэтымі, на першы погляд, сухімі статыстычнымі лічбамі — штодзённая свядомая рызыка ўласным жыццём дзеля спакою грамадзян, а не дзеля ўдзячнасці. Надзейнасць і высокая якасць нашых паслуг пацвярджаецца колькасцю ахоўных аб'ектаў, якая кожны дзень павялічваецца, наяўнасцю вялізнай колькасці пастаянных кліентаў. І гэты давер, аказаны народам, даражэй за ўсякія пахвалы!

**Іна ЧЫРЭЦ-МІШЫНА.**

■ На слыху

### З абрэзам — у банк

**18 лютага паступіла інфармацыя аб узброеным нападзе на філіял Беларусбанка, што ў гарадскім пасёлку Зялёны Бор. Для пацвярджэння гэтага факта на месца здарэння выбыла некалькі экіпажаў Жодзінскага аддзела аховы.**

Першай у аддзяленне банка прыбыла група затрымання ў складзе прапаршчыка міліцыі Дзмітрыя Сіняцкіна і старшыны міліцыі Антона Прылоўскага.

— Калі мы ўвайшлі ў памяшканне банка, выразна адчуваўся пах пораху, вакол быў беспарадак, пашкоджаны дзверы касавага аддзела, — распавядае Дзмітрый.

Супрацоўніца аддзялення змагла даволі падрабязна апісаць нападніка: невядомы быў у масцы з прарэхамі для вачэй, светлай кароткай куртцы, чорных штанах і чорных чаравіках. Міліцыянеры апыталі мінакоў, якія папярэдне апазналі зламысніка — адзін з відавочцаў па дзіўнай манеры хады пазнаў мясцовага жыхара, які меў не адну судзімасць. Мужчына назваў праваахоўнікам адрас падазраванага. Пакуль адзін экіпаж адправіўся адпрацоўваць гэтую версію, другі выбыў у кірунку, след якога вызначыў службовы сабака.

Другая група затрымання па слядах прайшла каля 700 м і на тэрыторыі прамысловай зоны, у кацельні, знайшла куртку рабаўніка. Пазней у гэтым перыметры следчыя знойдуць абрэз паляўнічай стрэльбы.

Лесапаркавая паласа аказалася невялікай. Нарад убачыў кампанію, якая распівала спіртное. У аднаго з выпівох на руках былі надзеты рабочыя пальчаткі, а з кішэні тырчалі буйныя купюры грошай...

Для далейшага разгляду шумная кампанія была дастаўлена ў Смалявіцкі РАУС.

Налётчыкам аказаўся менавіта гэты дзіўны грамадзянін, які так вылучаўся з натоўпу. Сваю віну прызнаў не адразу, усё адмаўляў. Зламыснік 1958 г.н. ужо быў неаднаразова судзімы за маёмасныя злачынствы. Паводле слоў мясцовых жыхароў, на волі ён доўга не затрымліваўся, маючы згубную схільнасць да наркотыкаў.

У дачыненні да затрыманага заведзена крымінальная справа.

**Алена ЯРМАЛІНСКАЯ.**

## КАЛІ ПРАЦА Ў РАДАСЦЬ

**Намеснік начальніка аддзялення камплектавання аддзела ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння Гродзенскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы Яніна Міхайлаўна Буйніцкая — прыгожая, абаяльная жанчына з іскрынкай у вачах. Форма ёй да твару. А яшчэ ёй да твару ўсмешка, якая выдае ў ёй шчаслівага чалавека.**



Яніна Міхайлаўна і не адмаўляе таго, што шчаслівая. «Трэба ставіцца да ўсіх з любоўю, а таксама любіць сваю працу. З добрым настроем прыходзіць на службу і вяртацца дадому», — кажа маёр міліцыі. Радуюць сям'я, маленькая ўнучка, калегі, большасць з якіх — мужчыны. А з імі, як лічыць Яніна Міхайлаўна, нашмат прасцей працаваць, таму што яны спакайней ставяцца да цяжкасцяў і ніколі не адмовяць у дапамозе. Таму ніякіх асаблівых сакрэтаў прыгажосці ў Яніны Буйніцкай няма. Уся справа — у станоўчых эмоцыях.

Працы ў міліцыі Яніна Міхайлаўна прысвяціла амаль трыццаць гадоў. Зусім хутка яна пойдзе на заслужаны адпачынак. Разумеючы, што цяпер трэба надаць больш увагі сям'і, усё ж з трывогай думае пра момант звальнення. «Нават не ведаю, як я буду без сваіх калег. Чым бліжэй да моманту звальнення, тым становіцца трывожней. Мая праца — гэта ўжо лад жыцця, звычка, — гаворыць Яніна Буйніцкая. — Калектыў аддзела ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння ўпраўлення працуе як зладжаны механізм. Кожны ведае сваю справу, але ў той жа час можа замяніць калегу пры неабходнасці. Кожны гатовы дапамагчы, нават калі гэта не звязана са службовымі абавязкамі».

Сёння медаль «За бездакорную службу» III ступені, Ганаровая грамата Дэпартамента аховы, падзяка міністра ўнутраных спраў, медаль «90 гадоў беларускай міліцыі», — далёка не ўсе ўзнагароды, якія мае маёр Буйніцкая, нягледзячы на тое, што ў органы ўнутраных спраў яна трапіла выпадкова. Аднойчы наша гераіня праходзіла міма Гродзенскага РАУС і вырашыла спытаць, ці няма для яе якой-небудзь працы. Намеснікам начальніка райаддзела тады быў Анатоль Аляксеевіч Белашэўскі, які прыняў яе ў штат на пасаду інспектара канцылярыі. Гэта было ў 1985 годзе. У 1987-м стала працаваць у Гродзенскім раённым падраздзяленні аховы, а з верасня 2001 года Яніна Міхайлаўна служыць у Гродзенскім абласным упраўленні Дэпартамента аховы.

«Спакойна тут ніколі не бывае, — расказвае пра спецыфіку працы Яніна Буйніцкая. — У сувязі з цякучасцю кадраў, трэба своечасова падрыхтаваць замену, каб падраздзяленні працавалі як належыць, каб не было некамплекта і вялікай нагрузкі на асабовы склад. Імкнёмся, каб колькасць звольненых супрацоўнікаў адпавядала колькасці тых, хто прыбыў на службу».

Летась Гродзенскае абласное ўпраўленне заняло другое месца ў рэспубліцы па камплектаванні. Як жа адбіраюцца кадры? Паводле слоў Яніны Міхайлаўны, зносіны з кандыдатам адбываюцца на працягу 4 месяцаў — паўгода. За гэты час можна вывучыць яго звычкі, лад жыцця, зразумець, як ён ставіцца да міліцэйскай службы. Намеснік начальніка аддзялення звяртае ўвагу на тое, як чалавек вучыўся, ці займаўся якімі-небудзь відамі спорту, ці прымаў удзел у грамадскім жыцці. І самае галоўнае патрабаванне да кандыдата — дысцыплінаванасць і законапаслухмянасць.

